Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя П.М. Машэрава"
Кафедра беларускага мовазнаўства

**А.С. Дзядова**

# Сучасныя тэхналогіі падрыхтоўкі да алімпіяды па беларускай мове

***Метадычныя рэкамендацыі***

Репозиторий ВГУ

*Віцебск*
*ВДУ імя П.М. Машэрава*
*2015*

УДК 811.161.3(075.8)
ББК 81.411.3-923
Д43

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава". Пратакол № 2 ад 24.12.2014 г.

Аўтар: дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат філалагічных навук **А.С. Дзядова**

Р э ц э н з е н т :
дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства ВДУ імя П.М. Машэрава,
кандыдат педагагічных навук *С.В. Мартынкевіч*

**Дзядова, А.С.**
**Д43** Сучасныя тэхналогіі падрыхтоўкі да алімпіяды па беларускай мове : метадычныя рэкамендацыі / А.С. Дзядова. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2015. – 48 с.

Вучэбнае выданне прызначана для студэнтаў філалагічных факультэтаў і змяшчае кароткую характарыстыку сучасных тэхналогій пры рашэнні лінгвістычных задач, метадычныя каментарыі, тэматычныя практычныя заданні, а таксама комплексныя заданні да заліку і спіс літаратуры для самастойнай працы.

Дапаможнік можа быць выкарыстаны настаўнікамі ў працэсе выкладання беларускай мовы, падрыхтоўкі вучняў да алімпіяд па беларускай мове, а таксама пры правядзенні факультатыўных заняткаў у агульнаадукацыйных установах.

**УДК 811.161.3(075.8)**
**ББК 81.411.3-923**

© Дзядова А.С., 2015
© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2015

Репозиторий ВГУ

# ПРАДМОВА

Выкладанне дысцыпліны “Алімпіядныя заданні па беларускай мове” мае на мэце актывізаваць, сістэматызаваць і паглыбіць веды студэнтаў па найбольш складаных тэмах фанетыкі і арфаэпіі, лексікалогіі і фразеалогіі, марфемікі і словаўтварэння, марфалогіі і сінтаксісу. Змест курса скіраваны на актывізацыю лінгвістычнага мыслення студэнтаў, выпрацоўку навыкаў творчага асэнсавання моўнай з’явы і пошуку неадназначных адказаў на нестандартныя заданні.

Дысцыпліна мае практычную скіраванасць у плане падрыхтоўкі настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, бо правядзенне алімпіяд па беларускай мове – абавязковы кампанент працы настаўніка-філолага ў сучасных сярэдніх агульнаадукацыйных установах. Мэта выкладання дысцыпліны – пазнаёміць студэнтаў з патрабаваннямі да правядзення алімпіяды па беларускай мове як навукова-педагагічнага мерапрыемства, паглыбіць іх тэарэтычную і практычную падрыхтоўку па беларускай мове праз выкананне разнастайных алімпіядных заданняў, выпрацаваць у будучых настаўнікаў навыкі складання алімпіядных заданняў у межах лінгвістычнага конкурсу.

Метадычная аснова выкладання курса – паглыбленне навыкаў аналізу разнастайных моўных з’яў, уменне рабіць аргументаваныя вывады і прыводзіць выразныя ўласныя ілюстрацыі. Пры выкладанні дысцыпліны трэба абавязкова прымаць пад увагу фактар беларуска-рускага двухмоўя ў краіне. З гэтай прычыны пры падборы вучэбнага матэрыялу асноўная ўвага павінна быць засяроджана на адметнасцях нацыянальнай мовы ў галіне фанетыкі, лексікі, фразеалогіі і граматыкі. Прапанаваныя выкладчыкам разнастайныя алімпіядныя заданні павінны стымуляваць пазнавальную дзейнасць студэнтаў, паглыбляць іх лінгвістычную эрудыцыю, павышаць культуру вуснага і пісьмовага маўлення, пабуджаць звяртацца да слоўнікаў і лінгвістычных даведнікаў рознага тыпу.

У вучэбным выданні коратка разгледжаны сучасныя тэхналогіі рашэння лінгвістычных задач, дадзены метадычныя каментарыі да практычных заняткаў, якія дазволяць звярнуць увагу на найбольш складаныя тэарэтычныя і практычныя аспекты дысцыпліны. Прапанаваныя студэнтам пытанні і практычны матэрыял (творчыя заданні, лінгвістычныя задачы, заданні-тэсты і інш.) размешчаны ў межах дзесяці асноўных тэм, па якіх праводзіцца праца на практычных занятках пад кіраўніцтвам выкладчыка, а таксама ў працэсе самастойнай працы. Прыведзены ўзоры комплексных заданняў да заліку, спіс навуковай літаратуры і лексікаграфічных крыніц.

Репозиторий ВГУ

# СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ РАШЭННЯ ЛІНГВІСТЫЧНЫХ ЗАДАЧ

XXI стагоддзе называюць стагоддзем тэхналогій. Сёння ні адна канкурэнтаздольная сфера жыцця чалавека не можа абысціся без інавацыйных тэхналогій. Слова “тэхналогія” паходзіць ад грэчаскага *techne* ‘мастацтва, майстэрства, уменне’ і *logos* ‘навука, закон’.

Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі азначаюць спосабы рэалізацыі новай парадыгмы адукацыі. Паняцце “тэхналогія навучання” на сённяшні дзень не з’яўляецца агульнапрынятым у традыцыйнай педагогіцы. З аднаго боку, тэхналогія навучання – гэта сукупнасць метадаў і сродкаў апрацоўкі і выкладу вучэбнай інфармацыі, а з другога – гэта навука аб спосабах уздзеяння настаўніка на вучняў у працэсе навучання з выкарыстаннем неабходных тэхнічных або інфармацыйных сродкаў.

Для рэалізацыі пазнавальнай і творчай актыўнасці вучняў у працэсе падрыхтоўкі да алімпіяды выкарыстоўваюцца разнастайныя сучасныя адукацыйныя тэхналогіі. У традыцыйнай сістэме адукацыйнага працэсу, як вядома, настаўнік транслiруе (перадае) навуковую інфармацыю, а вучань атрымлівае і асэнсоўвае яе. Згодна ж з сучаснымі адукацыйнымі тэхналогіямі, настаўнік павінен арганізаваць дзейнасць вучняў у інавацыйным адукацыйным асяроддзі, працуючы ў якім, вучні ажыццяўляюць пошук, выбар, аналіз, сістэматызацыю і прэзентацыю інфармацыі. Пры ацэнцы вучэбных дасягненняў вучняў па рашэнні лінгвістычных задач улічваецца наступнае: 1) наколькі вучні ўмеюць самастойна рашаць лінгвістычныя задачы на аснове сфарміраваных прадметных (мовазнаўчых) і ўніверсальных уменняў (а не ведаў!); 2) уменне вучыцца – здольнасць да самаарганізацыі.

Сучасныя падыходы да рашэння лінгвістычных задач павінны будавацца на прадастаўленні вучням магчымасці разважаць, супастаўляць розныя пункты гледжання вучоных на тую ці іншую мовазнаўчую праблему, фарміраваць і аргументаваць уласны пункт гледжання, абапіраючыся на веданне лінгвістычнай тэорыі, моўных законаў, з’яў, заканамернасцей мовы як сістэмы, на ўласныя назіранні над моўнымі фактамі.

Сярод сучасных тэхналогій рашэння лінгвістычных задач у працэсе падрыхтоўкі вучняў да алімпіяды мэтазгодна прымяняць наступныя:

1. ***Тэхналогію праблемнага навучання***, сутнасць якой заключаецца ў стварэнні пад кіраўніцтвам настаўніка праблемных сітуацый пры рашэнні лінгвістычных задач і арганізацыі актыўнай самастойнай дзейнасці вучняў, у выніку чаго адбываецца творчае авалоданне ведамі, уменнямі і навыкамі, развіваюцца разумовыя здольнасці, пашыраецца філалагічны кругагляд і мовазнаўчы досвед. Праблемная сітуацыя ствараецца з дапамогай актывізуючых дзеянняў, пытанняў педагога, якія падкрэсліваюць навізну,

Репозиторий ВГУ

важнасць і іншыя адрознівальныя якасці аб’екта пазнання. Пры гэтым адбываецца узнаўленне і актывізацыя інфармацыі, неабходнай для выканання задання, мадэляванне рашэнняў, прыняцце найбольш эфектыўнага з іх на аснове аналізу атрыманага адказу на лінгвістычную задачу. Між тым, трэба адзначыць, што ні занадта цяжкая, ні занадта лёгкая пазнавальная задача не ствараюць праблемнай сітуацыі для дзяцей. Вельмі важным у праблемным навучанні з’яўляецца ацэнка вынікаў дзейнасці – аналіз памылак і іх прычын пры выкананні заданняў, своеасаблівая “прафесійная экспертыза” памылковых адказаў.

2. ***Тэхналогію праектнай дзейнасці***, у працэсе рэалізацыі якой вучні выхоўваюць у сабе ініцыятыўнасць, самастойнасць у прыняцці рашэнняў, атрымліваюць магчымасць развіваць здольнасці да распрацоўкі некалькіх варыянтаў рашэнняў, у тым ліку і нестандартных. Праца настаўніка з улікам праектных метадаў навучання дае магчымасць развіваць творчыя здольнасці вучняў.

3. ***Тэхналогію дыстанцыйнага навучання***, заснаваную на забеспячэнні вучняў інфармацыйнымі адукацыйнымі рэсурсамі ў выглядзе вучэбна-метадычных матэрыялаў для самастойнай падрыхтоўкі да алімпіяды з выкарыстаннем розных відаў носьбітаў інфармацыі, у тым ліку і электронных, а таксама рэалізаваную праз правядзенне вэбінараў, онлайн-лекцый і інш.

4. ***Сістэму інавацыйнай ацэнкі “партфоліа”*** як спосабу фіксавання, накаплення, ацэнкі і персаніфікаванага ўліку дасягненняў вучня. Мэта партфоліа – убачыць “карціну” найбольш значных вынікаў падрыхтоўкі да алімпіяды, забяспечыць адсочванне “індывідуальнага росту” вучня ў шырокім адукацыйным кантэксце, прадэманстраваць яго здольнасць скарыстоўваць набытыя веды і ўменні на практыцы.

У працэсе ўкаранення сучасных тэхналогій у практыку падрыхтоўкі да алімпіяды вучні павінны ўдасканальваць навыкі працы з мовазнаўчай інфармацыяй – умець прадуктыўна працаваць з навуковай і даведачнай літаратурай (манаграфіямі, навуковымі артыкуламі, слоўнікамі ), ведаць найноўшыя лінгвістычныя выданні, а таксама інтэрпрэтаваць навуковыя веды, якія змяшчаюцца ў іх.

Выкарыстанне шырокага спектру сучасных адукацыйных тэхналогій дае настаўніку магчымасць аптымізаваць адукацыйны працэс, прадуктыўна выкарыстоўваць час, адведзены на падрыхтоўку вучняў да алімпіяды, і дамагацца іх высокіх вучэбных і навуковых дасягненняў.

# МЕТАДЫЧНЫЯ КАМЕНТАРЫІ ДА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

## Пералік неабходных ведаў, практычных уменняў і навыкаў студэнтаў

У працэсе вывучэння дысцыпліны студэнт павінен

***ведаць:***

– спецыфіку алімпіяды як формы кантролю ведаў вучняў;

– арфаэпічныя, лексічныя, арфаграфічныя, граматычныя, стылістычныя і іншыя нормы беларускай літаратурнай мовы;

– адметнасці нацыянальнай мовы ў галіне фанетыкі, лексікі, фразеалогіі і граматыкі;

– асноўныя набыткі беларускага мовазнаўства, вядомых айчынных лінгвістаў і іх навуковыя працы;

***умець:***

– раскрываць сутнасць моўных з’яў з дэманстрацыяй на канкрэтных прыкладах;

– складаць алімпіядныя заданні па розных раздзелах беларускай мовы;

– рашаць практычныя лінгвістычныя задачы, звязаныя з выкарыстаннем роднай мовы;

***валодаць:***

– навуковым кругаглядам і філалагічным мысленнем;

– асноўнымі прыёмамі творчага аналізу разнастайных моўных з’яў і лінгвістычнай літаратуры;

– навыкамі сістэмнасці, прадуманасці адпаведных методык і тэхналогій пры падрыхтоўцы вучняў да алімпіяды па беларускай мове.

Веды, якія атрымліваюць студэнты ў працэсе засваення дысцыпліны, абапіраюцца на веды, набытыя імі пры вывучэнні дысцыплін лінгвістычнага цыкла на папярэдніх курсах, у першую чаргу, уводзін у мовазнаўства, сучаснай беларускай мовы, гісторыі беларускай мовы, тэорыі і практыкі перакладу.

Для лекцыйных заняткаў адбіраецца такі тэарэтычны матэрыял, які патрабуе разгляду найбольш складаных пытанняў лінгвістычнай тэорыі, а таксама адлюстроўвае нацыянальна-культурную спецыфіку беларускай мовы. На практычных занятках асноўная ўвага павінна быць скіравана на выкананне прапанаваных выкладчыкам і складанне ўласных лінгвістычных задач павышанага ўзроўню складанасці.

Самастойная праца студэнтаў прадугледжвае выкананне індывідуальных заданняў па вызначаных выкладчыкам тэмах і пытаннях, рашэнне лінгвістычных задач павышанага ўзроўню складанасці, складанне алімпіядных заданняў. Для дыягностыкі вучэбных дасягненняў студэнтаў у працэсе вывучэння дысцыпліны мэтазгодна выкарыстоўваць

Рэпазіторый ВГУ

рознаўзроўневыя практычныя заданні, пісьмовыя працы, тэсты. Набытыя ўменні і навыкі, несумненна, паспрыяюць эфектыўнай прафесійнай дзейнасці будучых спецыялістаў-філолагаў.

У вучэбным выданні сярод прапанаваных студэнтам лінгвістычных заданняў дастаткова шмат такіх, якія былі ўключаны ў папярэднія гады ў змест комплекснай работы падчас Рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры. Пры падрыхтоўцы вучняў настаўніку трэба памятаць, што паспяховае выкананне імі алімпіядных заданняў будзе залежаць ад многіх фактараў, сярод якіх назавём наступныя:

1) наколькі вучні глыбока і асэнсавана засвоілі тэарэтычны матэрыял у межах розных раздзелаў беларускай мовы;

2) наколькі яны могуць правільна выкарыстоўваць на практыцы арфаэпічныя, акцэнталагічныя, лексічныя, словаўтваральныя і граматычныя нормы беларускай мовы;

3) наколькі ў вучняў сфарміраваны творчыя здольнасці, развіта філалагічнае мысленне і ўменне бачыць моўныя з’явы.

Якія ж пытанні патрабуюць найбольшай увагі як з боку настаўніка, так і з боку вучня пры падрыхтоўцы да алімпіяды? Асноўным патрабаваннем да вучняў па-ранейшаму застаецца добрае веданне нормаў, нацыянальна-культурнай адметнасці і спецыфікі беларускай мовы на ўсіх яе ўзроўнях.

Пры паўтарэнні раздзела **“Фанетыка і арфаэпія”** неабходна дабівацца грунтоўнага ведання асноўных характарыстык гукаў беларускай мовы, адметнасцей яе гукавой сістэмы і спецыфікі фанетычных законаў, трывалага засваення арфаэпічных і акцэнталагічных нормаў, разумення прычын адхіленняў ад беларускага літаратурнага вымаўлення.

Падчас рашэння лінгвістычных задач па раздзеле **“Лексікалогія”** вучням нярэдка даводзіцца сутыкнуцца з наступным пытаннем: як адрозніць з’яву мнагазначнасці ад з’явы аманіміі? У такім выпадку трэба памятаць наступнае. Мнагазначныя словы – гэта словы, якія маюць два і больш значэнні. У значэнні мнагазначных слоў заўсёды ёсць агульны сэнсавы стрыжань ці падобны сэнсавы кампанент. У тлумачальных слоўніках у якасці загалоўнага мнагазначнае слова запісана адзін раз, а яго значэнні падаюцца ў адным слоўнікавым артыкуле. Напрыклад: *бялок* 1) ‘празрыстая частка птушынага яйка’; 2) ‘непразрыстая абалонка вока’. Амонімы – гэта абсалютна розныя па значэнні словы, якія чыста выпадкова супадаюць гучаннем і напісаннем. У тлумачальных слоўніках амонімы падаюцца ў розных слоўнікавых артыкулах. Напрыклад: *касá* ‘доўгія заплеценыя разам валасы’; *касá* ‘ручная сельскагаспадарчая прылада працы’; *касá* ‘доўгая вузкая паласа сушы, якая цягнецца ад берага, мыс’.

Трэба адзначыць слабае засваенне некаторымі вучнямі лексічных нормаў беларускай мовы і яе сінанімічных магчымасцей. Многія не

Рэпазіторый ВДУ

ведаюць з’явы паранiмii, а таму з цяжкасцю заўважаюць або зусім не бачаць памылкі, звязаныя з парушэннем лексічнай спалучальнасці слоў, напрыклад: *Для выпраўлення сітуацыі былі прыняты эфектныя меры* (прыметнік *эфектныя* выкарыстаны замест *эфектыўныя*). Відавочна, што словы, ужытыя ў мове не з тым значэннем, якое замацавала за імі моўная практыка, разбураюць дакладнасць мовы.

У апошнія гады падчас алімпіяды вучням даволі часта прапануюцца заданні, выкананне якіх патрабуе ведання нацыянальна-культурнай семантыкі моўнай адзінкі – слова, фразеалагізма, прыказкі ці прымаўкі. У сувязі з гэтым трэба адзначыць, што кожны народ, які жыве ў пэўных геаграфічных, сацыяльных і культурных умовах, мае сваю гісторыю і традыцыі, нацыянальную псіхалогію і адлюстроўвае навакольную рэчаіснасць па-свойму. Словы, якія абазначаюць гэтыя асаблівасці, складаюць значную частку лексічнай сістэмы мовы і называюцца *безэквівалентнымі*, бо іх нельга перакласці на іншую мову пры дапамозе аднаслоўнага лексічнага адпаведніка. Безэквівалентная лексіка беларускай мовы ўяўляе сабой цікавы і арыгінальны моўны матэрыял, які нясе ў сабе нацыянальна-культурную адметнасць і характарызуе асаблівасці жыцця і побыту нашага народа. Прывядзём прыклады безэквівалентных у рускамоўным дачыненні слоў: бел. *бабка* – рус. *блюдо, приготовленное из запечённой тертой картошки*; бел. *бацвінне* – рус. *суп из стеблей и листьев молодой свёклы*; бел. *гладыш* – рус. *глиняный кувшин без ручки*; бел. *даспяліць* – рус. *довести до зрелости*; бел. *знепрытомнець* – рус. *потерять сознание*; бел. *залетась* – рус. *в позапрошлом году*; бел. *засень* – рус. *затененное место*; бел. *знічка* – рус. *падающая звезда*; бел. *кужаль* – рус. *очесанный лен* і і інш.

У працэсе актуалізацыі ведаў па **фразеалогіі** трэба спыніцца на разглядзе ўстойлівых спалучэнняў слоў і трапных народных выслоўяў не толькі з пункту гледжання іх значэння, структуры, паходжання, але і з боку трансляцыі ў іх традыцыйнай народнай культуры, міфалогіі, асаблівасцей светапогляду беларускага народа.

Спецыфіка алімпіядных заданняў і лінгвістычных задач у межах раздзела **“Марфеміка. Словаўтварэнне”** патрабуе ведаў адносна марфемнай структуры слова і разумення марфемы як мінімальнай значымай часткі слова. Галоўная прычына памылковага выканання заданняў па словаўтварэнні заключаецца найперш у тым, што многія вучні недастаткова добра ведаюць асноўныя спосабы ўтварэння слоў і парадак словаўтваральнага разбору. Некаторыя без усякай матывацыі бяруць у якасці базавага любое аднакаранёвае слова. Такія словы, як, напрыклад, *перапіс, перанесены, бясстрашны, падбярозавік* нельга разглядаць як прыставачныя дэрываты, бо гэта пярэчыць і фармальнай логіцы, і сэнсавай матывацыі. *Перапіс*$\varnothing$ – гэта бяссуфікснае ўтварэнне, бо абазначае ‘працэс ці вынік дзеяння *перапісваць*’. *Скамянелы і перанесены* – гэта

Рэпазіторый ВДУ

дзеепрыметнікі, асобыя формы адпаведных дзеясловаў *перанесці і скамянець.* Нагадаем, што ўсе дзеепрыметнікі з’яўляюцца суфіксальнымі ўтварэннямі ад адпаведных дзеяслоўных асноў. Трэба запомніць таксама, што ў якасці словаўтваральнай асновы трэба браць не адвольнае аднакаранёвае слова, а тое, якое знаходзіцца ў словаўтваральным ланцужку найбліжэй да аналізуемага вытворнага слова.

Як заўважалася вышэй, на алімпіядзе даволі часта сустракаюцца заданні, якія прадугледжваюць веданне яе ўдзельнікамі спецыфічных асаблівасцей беларускай мовы ў адрозненне ад рускай як у галіне фанетыкі, так і ў адносінах да **марфалогіі і сінтаксісу**. Традыцыйна ў межах лінгвістычнага конкурсу сустракаюцца заданні, якія правяраюць, наколькі глыбока вучнямі засвоены *граматычныя нормы беларускай мовы*, найперш правапіс канчаткаў розных чацін мовы у розных граматычных формах. Напрыклад, даволі часта праз сістэму самых разнастайных заданняў правяраецца правапіс канчаткаў назоўнікаў 2 скланення мужчынскага роду ў родным або месным склонах. Як паказвае моўная практыка, большасць школьнікаў, карыстаючыся штодзень пераважна рускай мовай, якая сёння ў сітуацыі блізкароднаснага беларуска-рускага білінгвізму больш распаўсюджана на тэрыторыі Беларусі, дрэнна ведае, які канчатак трэба ўжыць у той ці іншай граматычнай форме назоўніка, як правільна сказаць ці напісаць: *народ**а*** ці *народ**у***, *пры Андрэ**і*** ці *пры Андрэ**ю***, *турнір па тэніс**у*** ці *па тэніс**е***, *трэніраваліся па суботам* ці *па суботах* і інш. Заслугоўвае ўвагі пытанне пра адрозненне некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах у родзе і ліку.

Нярэдкімі з’яўляюцца памылкі пра выкананні алімпіядных заданняў, якія патрабуюць ведання пытання пра ўтварэнне ступеней параўнання прыметнікаў і асаблівасцей выкарыстання іх кароткіх формаў. Заўважым, што ў беларускай мове ступені параўнання прыметнікаў утвараюцца не па той жа самай схеме, як у рускай, таму нельга механічна пераносіць граматычныя нормы рускай мовы на беларускую. Некаторым вучням (а часам і студэнтам) даволі складана ўбачыць сказ або словазлучэнне з граматычнай памылкай ва ўтварэнні пэўнай ступені параўнання прыметніка і запісаць яго ў патрэбнай форме.

Невысокі ўзровень выканання алімпіядных заданняў і на веданне граматычных нормаў у галіне дзеяслова. Так, заданні на правапіс асабовых канчаткаў дзеясловаў, найперш у форме 2-й асобы множнага ліку абвеснага ладу, па-ранейшаму застаюцца “праблемнымі”. І хоць у школьным падручніку па беларускай мове сказана пра тыповыя памылкі вучняў у асабовых канчатках дзеясловаў, у тым ліку і пра інтэрферэнтныя (выкліканыя ўплывам рускай мовы), усё ж тэма гэтая засвойваецца вельмі слаба. Вучні працягваюць пісаць *завеце* замест *завяце*, *жывеце* замест *жывяце*; *бярэм, нясем* у 1 асобе множнага ліку абвеснага ладу замест правільных формаў *бяром, нясём*, што вымагае яшчэ раз у працэсе

Рэпазіторый ВДУ

падрыхтоўкі да алімпіяды ўважліва паставіцца да паўтарэння гэтага дастаткова складанага пытання.

Не лепшая сітуацыя і з веданнем нарматыўнага ўжывання дзеепрыметнікаў і дзепрыслоўяў у беларускай мове. Нагадаем, што не ўсе дзеепрыметнікі ў беларускай мове аднолькава пашыраны. Так, неабмежавана ўжываюцца дзеепрыметнікі залежнага стану прошлага часу з суфіксамі -н-, -ен-, -ан-, -т: *пасея-н-ае жыта, купл-ен-ае паліто, запрош-ан-ыя госці, вымы-т-ая падлога* і незалежнага стану прошлага часу з суфіксам -л- : *паспе-л-ыя ягады, набале-л-ае пытанне, зарос-л-ы бераг.* Разам з тым, трэба пазбягаць ужывання дзеепрыметнікаў незалежнага стану прошлага часу з суфіксамі -ўш-,
-ш-: *зазеляне-ўш-ае поле, засох-ш-ая трава;* дзеепрыметнікаў незалежнага стану цяперашняга часу з суфіксамі -уч-(-юч-), -ач-(-яч-): *малю-юч-ая дзяўчынка, сядз-яч-ыя пасажыры;* дзеепрыметнікаў залежнага стану з суфіксамі -ем-, ім-: *чыта-ем-ыя кнігі, праводз-ім-ыя мерапрыемствы* і інш. Дзеепрыметнікі з такімі суфіксамі характэрны, як правіла, для справаводнага і навуковага стыляў: *узраста-юч-ая функ-цыя, бяг-уч-ы рахунак, даследу-ем-ае пытанне.* Нельга ўжываць таксама 1) дзеепрыметнікі прошлага часу з суфіксамі -ўш-, -ш- у форме мужчынскага роду назоўнага склону, бо яны аманімічныя з дзеепрыслоўямі: *Чалавек, чытаўшы газету, заснуў*; 2) зваротныя дзеепрыметнікі: *купаўшаяся дзяўчынка, сапсаваўшаеся надвор'е.* Прыведзеныя прыклады з'яўляюцца тыповымі граматычнымі памылкамі.

Вельмі ўважліва трэба паставіцца да актуалізацыі ведаў па раздзеле "**Сінтаксіс і пунктуацыя**". Гэта пытанні каардынацыі дзейніка і выказніка у родзе і ліку, тэорыі двухсастаўнага і аднасастаўнага сказа, пытанні, звязаныя са структурай складанага сказа і рознымі відамі адносін паміж яго часткамі і інш. Заўважым, што некаторыя вучні не зусім дакладна ўяўляюць, як адрозніць двухсастаўны няпоўны сказ ад аднасастаўнага (назыўнога). Нагадаем, што двухсастаўныя няпоўныя сказы з апушчаным дзеяслоўным выказнікам са значэннем наяўнасці, быцця, існавання або актыўнага дзеяння ці руху называюцца эліптычнымі. Іх абавязковай прыкметай з'яўляецца наяўнасць акалічнасці з саставу апушчанага выказніка і разарванасць граматычных сувязей. Напрыклад: *На стале перада мною партрэт маці. У лесе цішыня.*

Шмат памылак і недахопаў рознага тыпу дапускаецца ў працэсе выканання заданняў, разлічаных на веданне тэорыі як простага, так і складанага сказа. Думаецца, пры падрыхтоўцы вучняў да алімпіяды па беларускай мове нельга таксама пакінуць без увагі пытанні пастаноўкі знакаў прыпынку ў розных відах сінтаксічных канструкцый, не забываючыся пра тое, што нярэдка як у простым, так і ў складаным сказе можа назірацца варыянтнасць у пастаноўцы знакаў прыпынку, а то і іх факультатыўнасць.

Рэпазіторый ВГУ

# Тэма 1. Фанетычная сістэма беларускай мовы. Беларуская арфаэпія і акцэнтуацыя

**Пытанні**

1.Фанетычная сістэма беларускай мовы. Галосныя і зычныя гукі, іх класіфікацыя. Асаблівасці беларускай фанетыкі ў параўнанні з рускай.

2.Арфаэпічныя нормы беларускай мовы. Адхіленні ад арфаэпічных нормаў і іх прычыны.

3.Акцэнталагічныя нормы. Асаблівасці націску ў некаторых словах і граматычных формах.

**Заданне 1.** Якія спецыфічныя рысы беларускай фанетыкі адлюстраваны ў наступнай прыказцы: “Госць першы дзень – золата, другі – серабро, а трэці – медзь, хоць дадому едзь”? Выпішыце з прыказкі як мага больш слоў, якія ілюструюць гэтыя рысы.

*За кожнае правільна выпісанае слова – 0,5 бала.*

**Заданне 2.** Назавіце радок, у якім ва ўсіх словах колькасць гукаў аднолькавая.

1) разжаліцца, нясвіжскі, на кладцы;
2) паказчык, у палатцы, ручнік;
3) лётчык, езджу, сшытак;
4) веснік, сэрца, вучышся;
5) дождж, дзень, вуліца.

*Максімальная колькасць балаў – 2.*

**Заданне 3.** Прывядзіце прыклады, якія даказваюць, што літара ***З* (“зэ”)** можа абазначаць розныя гукі.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

**Заданне 4.** Вызначце, якімі гукамі адрозніваюцца наступныя пары слоў.

Радон – раён, гуслі – яслі, ясень – вязень, сядзь – сад, рэдзька – рэдка, вёў – вол.

*За кожны правільна вызначаны гук – 0,2 бала.*

**Заданне 5.** Прааналізуйце гукавы склад праведзеных слоў і вызначце, якія з прыведзеных пар слоў маюць агульныя зычныя гукі. Адзначце гэтыя гукі.

Яма – май, счапіць – сыраежка, стол – год, елка – клён, пэндзаль – дзверы, канчатак – дождж, параход – абшлаг, сляза – скрозь.

*0,5 бала за кожную правільна выпісаную пару і адзначаны гук.*



Репозиторий ВГУ

**Заданне 6.** Прачытайце наступныя пары слоў, аб'яднаныя гістарычнай агульнасцю кораня: *опыт – вопыт, устрица – вустрыца, льготный – ільготны, ржаной – аржаны, она – яна.* Адкажыце, якія фанетычныя прычыны абумовілі фармальнае разыходжанне слоў у рускай і беларускай мовах.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

**Заданне 7.** Беларускі мовазнавец Янка Станкевіч настойліва даводзіў, што "парадак літар беларускай кірыліцы павінен быць такі: О, А, Э, Б, Г, Ґ, Х, Д, Е, Ё, Я, ДЗ, ДЖ, З, Ж, І, Й, К, Л, М, Н, Ф, П, Р, С, Ш, Т, В, У, Ў, Ь, Ц, Ч, Ы, Ю". Як Вы думаеце, чым можна растлумачыць незвычайны пачатак такога варыянту алфавіта: ***О, А, Э…***?

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

**Заданне 8**. Перакладзіце словы на беларускую мову, пастаўце націск. Адзначце разыходжанні ў акцэнталагічных нормах беларускай і рускай моў.

Крапива, ворота, волосы, одиннадцать, апрель, верба, маленький, обручи, воду, душу, стену, под гору, фарфор, четырнадцать, лопух, каталог, везти, нести, валенок, на ногу, поровну, на печи, дочка, босой, каменный.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 9.** Прафесар амерыканскага ўніверсітэта пытаецца ў аднаго са студэнтаў:

*– Што, на Вашу думку, больш за ўсё перашкаджае правільнаму вымаўленню слоў нашай мовы?*

*– Без усякага сумнення, – гэта жуйка.*

А якія ўплывы перашкаджаюць правільнаму вымаўленню гукаў і слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове? Прывядзіце ўласныя прыклады.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

## Тэма 2. Лексікалогія. Лексікаграфія

**Пытанні**

1. Лексічнае багацце беларускай мовы. Адназначныя і мнагазначныя словы. Адрозненне мнагазначнасці ад аманіміі.
2. Сінонімы, антонімы, паронімы, іх ужыванне ў мове. Лексічная спалучальнасць слоў.
3. Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання. Прафесіяналізмы. Слова-тэрмін у мове. Дыялектная лексіка.



Репозиторий ВГУ

4. Нацыянальна-культурны кампанент у значэнні слова. Безэквівалентная лексіка.

5. Слоўнікі, іх тыпы, будова, прызначэнне.

**Заданне 1.** Амонімамі **(1)** ці мнагазначнымі словамі **(2)** з’яўляюцца пары выдзеленых слоў у словазлучэннях. Пастаўце адпаведную лічбу.

| Пары слоў | Пары слоў |
|---|---|
| 1) ***пралёт*** самалётаў – ***пралёт*** вуліцы | 4) адзенне з ***байкі*** – ***байкі*** Кандрата Крапівы |
| 2) пчаліныя ***соты*** – ***соты*** ў чарзе | 5) ***падатлівы*** характар – ***падатлівы*** метал |
| 3) ***кіслы*** яблык – ***кіслы*** настрой | 6) кукурузны ***пачатак*** – ***пачатак*** года |

*Максімальная колькасць балаў – 3 (0,5 бала за кожную пару).*

**Заданне 2.** Упішыце кожную пару слоў у адпаведны слупок табліцы.

Абкапаць – абкапаць, вялікі – велічэзны, грубка – групка, звычайны – звычаёвы, знаць – знаць, козка – коска, круціцца – кружыцца, начынка – начынне, піла – піла, прыклад – прыклад.

| | |
|---|---|
| **Сінонімы** | |
| **Паронімы** | |
| **Амографы** | |
| **Амафоны** | |
| **Амаформы** | |

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 3.** Размяжуйце **архаізмы** і **гістарызмы**. Да архаізмаў прывядзіце сучасныя адпаведнікі:

Атрамант, веча, вярста, іспыты, ланіты, паморак, радца, рондаль, станавы прыстаў, ятвягі.

| | |
|---|---|
| **Архаізмы** | |
| **Сінонімы да архаізмаў** | |
| **Гістарызмы** | |

*Максімальная колькасць балаў – 8 (за правільна вызначаны гістарызм – 0,5 бала, за правільна вызначаны архаізм і яго сучасны адпаведнік – 0,5 бала).*

**Заданне 4.** Растлумачце лексічнае значэнне наступных слоў, якія характарызуюць этнакультурныя адметнасці побыту беларускага народа.

Репозиторий БГУ

Абшыванка, выцінанка, вышыванка, вячоркі, грачанік, жур, зэдлік, кляновік, медавуха, талака.

*За адно правільна растлумачанае слова – 0,5 бала.*

**Заданне 5.** Раскрыйце сакрэт "прыгатавання" страў, названых Янкам Купалам у вершы "Гутарка аб кепскім гаспадару": *Груца ды заціркa, / Цэд, цура, кісель, / Мілта, саладуха – / Амаль стравы ўсе.*

| Назва стравы | Характар стравы |
|---|---|
| *Груца* | |
| *Зацірка* | |
| *Цэд* | |
| *Цура* | |
| *Кісель* | |
| *Мілта* | |
| *Саладуха* | |

*Максімальная колькасць балаў – 7.*

**Заданне 6.** Прачытайце сказы. Замест тлумачэння слоў, што пададзена ў дужках, запішыце ў пачатковай форме словы, якія адпавядаюць прыведзеным значэнням.

1. Над зацягнутым (1. *зялёнай паверхняй з водарасцей, якой пакрываецца застаялая вада*) і (2. *жабінай ікрой*) берагам сажалкі да самай вады схіліліся старыя дуплаватыя вербы. Да самых местачковых хат падышла паводка, заліла (3. *лугі ў пойме ракі*) і грады, двары і нізкія вуліцы, (4. *месцы каля вёскі, дзе пасецца жывёла, птушка*) і зарэчныя лугі, далёкія (5. *наносныя пясчаныя пагоркі*), затапіла астравы, лазнякі і алешнікі, далёкія дубы па самую макаўку стаяць у вадзе (С.Грахоўскі).

1 –…; 2 –…; 3 –…; 4 –… ; 5 –….

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 7.** Да апісальных назваў пэўных паняццяў, прадметаў, з'яў, працэсаў, дзеянняў ці таго, што складае рэаліі навакольнага свету ў рускай мове, запішыце аднаслоўныя беларускамоўныя адпаведнікі.

| Руская мова | Беларуская мова |
|---|---|
| Жгучая крапива | |
| Место, где стоял или стоит замок | |
| Впасть в детство, вести себя подобно ребёнку | |
| Теплые страны, куда летят зимовать пералётные птицы | |
| Возвышенный участок леса в бору | |

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Репозиторий ВГУ

**Заданне 8.** Запішыце, якія назвы месяцаў адпавядаюць паняццям, аформленым з дапамогай слоў, дадзеных ніжэй. Растлумачце, якім чынам у семантыцы прыведзеных лексічных адзінак адлюстравалася матэрыяльная і духоўная культура беларусаў?

Агароднік – …; бліннік – …; бярозавік – …; вясельнік – …; вясеннік – …; мёднік – …; мясаед – …; поснік – …; спаснік – …; хлебнік – …; шчаўнік – …; ягаднік – … .

*Максімальная колькасць балаў – 6 (0,5 бала за кожную пару і правільнае тлумачэнне).*

**Заданне 9.** Запішыце, як называюцца:

1. Пальцы на руцэ:……………………………………………………..
2. Разрады слоў у спецыяльнай лексіцы:...……………………..
3. Асноўныя роды літаратуры:…………………………………

*0,5 бала за кожнае правільна названае слова.*

**Заданне 10.** Якую прапушчаную літару трэба ўставіць, каб слова ***гру…ка*** мела наступнае лексічнае значэнне: ‘невялікая, звычайна кафельная, пакаёвая печ’?

1) літару ***з*** 3) літару ***б*** 5) літару ***д***
2) літару ***ш*** 4) літару ***п***

*Максімальная колькасць балаў –2.*

**Заданне 11.** Чым заварвала маці чай для дзяцей у вершы М. Маляўкі “Чай ад мамы”? Адзначце патрэбны сінонім. Растлумачце свой выбар.

Мама чаю не купляла, / Мама мела свой запас – / **Святаяннікам**, бывала, / Чай заварвала для нас.

1) валошкамі; 2) зверабоем; 3) хмелем; 4) ліпавым цветам; 5) рамонкамі.

*Максімальная колькасць балаў – 2.*

**Заданне 12.** У “Беларускай граматыцы для школ” Б. Тарашкевіча (1918 г.) сустракаюцца наступныя лінгвістычныя тэрміны: *зложныя словы, клічнае слова, недаказ, неазначальнік, прадлог, прадметнік, пункт, чужаслоў.* Падбярыце да кожнага з іх адпаведнік з сучаснай лінгвістычнай тэрміналогіі. Якія з тэрмінаў, выпрацаваных Б. Тарашкевічам, захаваліся і сёння?

*За кожны правільна падабраны адпаведнік ці прыведзены тэрмін – 0,5 бала.*

**Заданне 13.** Устанавіце адпаведнасць паміж тэрмінамі, якія прапаноўваліся мовазнаўцамі ў 20-я гады ХХ ст., і сучаснымі лексічнымі

Рэпазіторый ВГУ

адпаведнікамі. Адказ запішыце ў форме літарна-лічбавага спалучэння.

| **Тэрмін 20-х гадоў XX ст.** | **Сучасны адпаведнік тэрміна** |
|---|---|
| **А.** зельнік | **1.** гібрыд |
| **Б.** мяшанец | **2.** паразіт |
| **В.** прысваенне | **3.** гербарый |
| **Г.** чужаед | **4.** інтэрмедыя, інтэрлюдыя |
| **Д.** паміждзея | **5.** гармонія |
| **Е.** суладжванне | **6.** асіміляцыя |
| **Правільны адказ**: | |

*Максімальная колькасць балаў – 3 (0,5 за правільна вызначаную пару).*

**Заданне 14.** Размяркуйце тэрміны *афікс, легенда, лексікаграфія, метанімія, параўнальны зварот, параўнанне, пародыя, санет, сімвал, троп* па названых групах:

1. Лінгвістычныя тэрміны:
2. Літаратуразнаўчыя тэрміны:
3. Лінгвістычныя і літаратуразнаўчыя тэрміны адначасова:

*За кожны правільна прыведзены прыклад – 0,5 бала.*

**Заданне 15.** Вядомы мовазнаўца Алесь Каўрус сцвярджае, што ў вуснай і пісьмовай мове нярэдкія выпадкі празмернасці выражэння (таўталогія, плеаназм). Падкрэсліце ў прапанаваных сказах неабавязковыя, лішнія словы.

1. Хлопцы выйшлі на ўзлесак і ад яго праставалі напрамкі праз вузкую лапіну поля.
2. На старой ліпе з усіх сіл шчыравалі буслы.
3. Старанная праца кіпіць на заводзе.
4.Выдавецтва планавала сваю работу і выпускала падручнікі і вучэбныя дапаможнікі выключна толькі на рускай мове.
5. Марыля шчаслівымі ад радасці вачыма глядзела на сваіх дзетак.
6. Дзядзька Антось безвынікова стукаўся ў дзверы розных службовых інстанцый і не мог ніяк адчыніць іх.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

**Заданне 16.** У межах дыялектнай лексікі даволі часта сустракаюцца семантычныя дыялектызмы. Аднымі з такіх слоў, уключаных у “Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны” (ч. 1, 2012; ч. 2, 2014), з’яўляюцца назоўнікі **каза і казёл.** Першае з іх у рэестравай частцы слоўніка сустракаеццца тройчы, другое – аж пяць разоў. Чаму? З якімі значэннямі дадзеныя словы ўжываюцца ў гаворках Віцебшчыны.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*



Репозиторий ВГУ

**Заданне 17.** Ірынка знайшла *1 баравік*, у Максіма ў кошыку аказалася *3 лісічкі*, Вася далучыў да агульнай колькасці *тузін сыраежак*, а Вера – *чортаў тузін* казлякоў. Колькі ўсяго грыбоў назбіралі дзеці?

1) дваццаць пяць; 2) дваццаць шэсць; 3) дваццаць восем; 4) дваццаць дзевяць; 5) трыццаць.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

**Заданне 18.** Растлумачце, якой прыметай матывавана кожнае выдзеленае ў тэксце слова.

Не выбіраем, / Спрытна зразаем / Шапкі, галоўкі /**Ахабкам, / Радоўкам, / Ваўнянкам, / Бялянкам, / Таўстушкам, / Гаркушкам**. (Х. Жычка)

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

**Заданне 19.** Які даведнік у пачатку XX ст. называлі “*слоўнік месны*”?

1) этымалагічны слоўнік; 2) тлумачальны слоўнік;
3) дыялектны слоўнік; 4) арфаэпічны слоўнік;
5) фразеалагічны слоўнік.

*Максімальная колькасць балаў – 2.*

**Заданне 20.** На аснове наступных словаўжыванняў складзіце слоўнікавыя артыкулы

**1. Для слова *праўда*.**

1. *Праўда* вочы коле (прыказка). 2. Ды пашлі ж ты, Божа, *праўду* сваю тую з неба на зямельку, слязьмі залітую! (Ф. Багушэвіч). 3. *Праўда,* каб ведаў адразу, што чакае яго, мо яшчэ і падумаў бы: ці варта наважыцца на такое? (В. Быкаў). 4.Сенакос добры, *праўда* далекавата ад вёскі.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

**2. Для слова *шчасце.***

1. Паўстань, народ! Для будучыны *шчасце* ты строй, каб тут не строіў больш сусед! (Я. Купала). 2. Мне выпала *шчасце* быць знаёмым з некаторымі беларускімі пісьменнікамі. 3. Днём, *на шчасце*, дажджу не было.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

**Заданне 21.** Складзіце і запішыце слоўнікавыя артыкулы для тлумачальнага слоўніка са словамі ***кубанка*** і ***лавіна.***

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

**Заданне 22.** Чым адрозніваюцца лінгвістычныя слоўнікі ад энцыклапедычных? Якія вы ведаеце тыпы лінгвістычных слоўнікаў? Успомніце і прывядзіце як мага больш назваў слоўнікаў і энцыклапедый.

*За кожную правільна і дакладна прыведзеную назву – 1 бал.*



Репозиторий ВГУ

## Тэма 3. Фразеалогія. Фразеаграфія

**Пытанні**

1.Фразеалагізмы, іх значэнне і ўжыванне.

2.Фразеалагізмы, прыказкі і прымаўкі як носьбіты нацыянальна-культурнай інфармацыі.

3. Беларуская фразеаграфія.

**Заданне 1.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і народнымі афарызмамі рускай і беларускай моў. Адказ запішыце ў форме літарна-лічбавага спалучэння.

| **Руская мова** | **Беларуская мова** |
|---|---|
| **А.** По труду и честь. | **1.** *Ад ляноты чакай бядоты.* |
| **Б.** Задавать тон. | **2.** *Будзе на лета, але не на гэта.* |
| **В.** Труд человека кормит, а лень портит. | **3.** *Якая справа, такая і слава.* |
| **Г.** Улита едет – когда- то будет. | **4.** *Яму гавары, а ён дагары.* |
| **Д.** Я про Фому, а он про Ерему. | **5.** *Рэй весці.* |
| **Літарна-лічбавая адпаведнасць:** | |

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 2.** Сярод прыведзеных фразеалагізмаў, якія характарызуюць чалавека ў пэўных адносінах, знайдзіце і выпішыце тыя, якія маюць адмоўную канатацыю (сэнсавы кампанент). Растлумачце іх значэнне. У якіх фразеалагізмах структурныя кампаненты маюць нацыянальна-культурную семантыку?

Драць горла, залівацца салаўём, жвір у вочы сыпаць, выйсці ў людзі, біць у хамут, цаны няма, мякіна ў галаве, брэша як лён чэша, гнуць спіну, гарыць у руках, як мыла з'еўшы, гаворыць як крыніца булькоча, выносіць смецце з хаты, рабіць душы паслухаўшы, малоць не падсяваючы, чортам падшыты.

*За кожны правільна выпісаны фразеалагізм – 0,5 бала.*

**Заданне 3.** Выпішыце фразеалагізмы,

1) аб'яднаныя значэннем *'прыслугоўваць, дагаджаць, ліслівіць'* :

Біць у званы, у пер'е ўбрацца, лістам слацца, ісці рукой, хадзіць на задніх лапках, віляць хвастом, акунёў вудзіць, глядзець у рот, падпусціць лёстачак, вады не замуціць, пець лазара, свяціць вачыма, строіць кепікі, насіць на руках;

2) аб'яднаныя значэннем *'хлусіць, падманваць, ашукваць'* :

Ліса фарбаваць, вадзіць за нос, з ветру вяроўкі віць, казу лабатую плесці, язык як мянташка, пра жураўля на хвойцы расказваць, слязьмі аблівацца, смаловы дуб плесці, снег саломаю тушыць, пудрыць мазгі.



Репозиторий ВГУ

Хто з беларускіх мовазнаўцаў вывучаў (вывучае) устойлівыя адзінкі мовы?

*За кожны правільна выпісаны фразеалагізм – 0,5 бала.*

**Заданне 4.** У кожным слупку знайдзіце “лішні” фразеалагізм. Растлумачце, чаму ён “лішні”.

| | |
|---|---|
| *1. За вушы не адцягнеш;<br>пальчыкі абліжаш;<br>расце ў роце;<br>у роце растае.* | *2.Курам на смех;<br>не лезе ні ў якія вароты;<br>нікуды не варты;<br>як курыца лапай.* |
| *3. Даць жару;<br>даваць стракача;<br>здымаць стружку;<br>намыліць шыю.* | *4. Адным скокам;<br>на адной назе;<br>на шырокую нагу;<br>як на пажар.* |

*За кожны правільна выпісаны фразеалагізм і яго тлумачэнне – 1 бал.*

**Заданне 5.** Запоўніце табліцу, аднавіўшы адносіны паміж фразеалагізмамі і іх значэннем.

| **Фразеалагічны адпаведнік** | **Значэнне фразеалагічнай адзінкі** |
|---|---|
| | *драмаць седзячы* |
| атрымаць гарбуза | |
| | *вельмі даўно* |
| ні села ні пала | |
| | *невядома калі; ніколі* |

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 6.** Запішыце як мага больш сінанімічных прыказак да наступнага трапнага народнага выслоўя: “Якая заслуга, такая і пашана”.

*За кожную правільна запісаную прыказку – 1 бал.*

**Заданне 7.** Аднавіце прыказкі, замяніўшы ў кожнай адну з яе частак на дакладны адпаведнік.

1. Бачыць вока, ды не штодня – ….
2. Каб рыбу есці, трэба ёй пакланіцца – ….
3. Чужое не тучыць, бо і хлеб з’ядуць і торбу ўкрадуць – ….
4. Вясна кветкамі багата, а ён мне пра гарбузы –….
5. Каб ведаў, дзе яма, то залатога б каня меў –….

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 8.** Устаўце ў прыказкі патрэбныя словы, якія з’яўляюцца назвамі частак маўленчага апарату. Растлумачце сэнс прыказак.

1. За чужой шчакой … не баліць. 2. Знаеш ты толькі, што з … ў … .

Репозиторий ВГУ

3. Сказанага слова да … не вернеш. 4. Еш капусту з грыбамі, а … трымай за зубамі. 5. … шырокае, ды кішка тонкая.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 9.** Некалі М. А. Янкоўскі слушна заўважаў: “Беларускія прыказкі – гэта музеі, дзе можна знайсці ўсё, што звязана з жыццём беларускага народа”. Прывядзіце прыклады прыказак, у структуру якіх уваходзяць побытавыя назвы (назвы страў беларускай нацыянальнай кухні, адзення, прылад працы, пабудоў, наймені рэлігійных свят і інш.).

*За кожную правільна прыведзеную прыказку – 1 бал.*

**Заданне 10.** Як вядома, у прыказках не сустракаюцца такія “гучныя” словы і іх спалучэнні, як *патрыятызм, адданасць Радзіме* і інш. Прывядзіце прыклады трапных народных выслоўяў, у якіх раскрываецца патрыятычнае пачуццё, вернасць чалавека роднай зямлі і любоў да яе. Якія структурныя кампаненты прыведзеных парэміялагічных адзінак маюць нацыянальна-культурнае ці сімвалічнае значэнне?

*За кожную правільна прыведзеную прыказку – 1 бал.*

**Заданне 11.** На якія пытанні могуць даць адказ прыведзеныя ніжэй слоўнікі? Сфармулюйце пытанне да кожнага слоўніка.

1. Лепешаў, І.Я. Слоўнік фразеалагізмаў беларускай мовы: у 2 т. / І.Я. Лепешаў. – Мінск : БелЭН імя П. Броўкі, 2008. – Т. 1–2.
2. Лепешаў, І.Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І.Я. Лепешаў. – Мінск, 2004.
3. Ляшчынская, В. А. Слоўнік фразеалагізмаў мовы твораў Янкі Купалы / В. А. Ляшчынская, З. У. Шведава. – Гомель, 2007.
4. Киселев, И. А. Русско-белорусский фразеологический словарь / И. А. Киселев. – Минск, 1991.
5. Мяцельская, Е. С. Слоўнік беларускай народнай фразеалогіі / Е. С. Мяцельская, Я. М. Камароўскі. – Мінск,1972.
6. Юрчанка, Г. Ф. І коціцца і валіцца. Устойлівыя словазлучэнні ў гаворцы Мсціслаўшчыны.– Мінск, 1972.
7. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / Склад. Ф. Янкоўскі. – Мінск : Бел.навука, 2004.
8. Даніловіч, М.А. Слоўнік дыялектнай фразеалогіі Гродзеншчыны.– Гродна, 2000.
9. Корсак, Л. Англа-беларускі слоўнік фразеалагізмаў параўнальнага тыпу / Л. Корсак, Л. Марціновіч. –Мінск,1984.
10. Санько З. Малы руска-беларускі слоўнік прыказак, прымавак і фразем. – Мінск, 1991.

*0,5 бала за кожнае правільна пастаўленае пытанне.*

Репозиторий ВГУ

**Заданне 12.** У “Этымалагічным слоўніку фразеалагізмаў” І. Я. Лепешава (Мінск, 2004) прачытайце гісторыка-этымалагічныя даведкі да прыведзеных фразеалагізмаў. Якія веды пра гістарычнае мінулае і культуру беларускага народа зафіксаваны ў іх?

*Як Заблоцкі на мыле, як дзядзька ў Вільні, як Піліп з канапель, лахі пад пахі, як серада з-пад пятніцы.*

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

## Тэма 4. Марфеміка. Словаўтварэнне

**Пытанні**

1. Марфемы як значымыя часткі слова. Аснова і канчатак, іх тыпы.

2. Асноўныя спосабы словаўтварэння ў беларускай мове. Афіксальныя спосабы. Спосабы складання.

**Заданне 1.** Выпішыце словы з прыстаўкай **а-**.

Авёс, азімут, ажыны, адхіліць, адрас, адухаўленне, адзенне, асваенне, асветны, асяродак, афіша, ашчаджаць, аржаны, асушыць, азеляненне, амшарына.

*За кожнае правільна выпісанае слова – 0,5 бала.*

**Заданне 2.** Выпішыце нумары слоў, якія не маюць канчаткаў.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1) імкліва<br>2) пехатой<br>3) змарыўся | 4) паціху<br>5) уверсе<br>6) Байкал | 7) Лавуазье<br>8) побач<br>9) узлесак | 10) стрыгся<br>11) захапляцца<br>12) смеючыся |

*За кожны правільна выпісаны нумар слова – 0,5 бала.*

**Заданне 3.** Выпішыце нумары слоў з нулявым канчаткам .

| | | |
|---|---|---|
| 1) спрадвеку<br>2) насып<br>3) трубаўкладчык<br>4) дагледжанасць | 5) далеч<br>6) заціхаць<br>7) рыхтаваўся<br>8) БАМ | 9) склаўшы<br>10) рэзюмэ<br>11) мадам<br>12) збоку |

*За кожны правільна выпісаны нумар слова – 0,5 бала.*

**Заданне 4.** Выпішыце нумары слоў, марфемны склад якіх адпавядае ўказанай схеме. (У схемах значком □ абазначаны любы канчатак, не толькі нулявы).

| **Варыянт 1**<br>∩□▬∩∧∧□ | **Варыянт 2**<br>¬∩□∧□ | **Варыянт 3**<br>¬∩∧∧ |
|---|---|---|
| землечарпалка<br>землетрасенне | падкручвай<br>на́двае | па-майстэрску<br>дапаласкаць |



Репозиторий ВГУ

| | | |
|---|---|---|
| каменяломня<br>канавакапальны | нерэальны<br>незвычайны | падагрэць<br>падабраць |

*За кожны правільна выпісаны нумар слова – 0,5 бала.*

**Заданне 5.** Выпішыце толькі тыя словы, якія маюць чатыры суфіксы, абазначце іх.

Выратавальніца, зліквідаваць, выпрабавальнік, чарнічнік, патрабавальна, зацікаўленасць, баравінка, арганізаванасць, верхавіна, падагравальнік.

*Адно правільна выпісанае слова – 1 бал.*

**Заданне 6.** У вершы Янкі Купалы “Свайму народу” ёсць такі радок: “*Табе, народ мой, **<u>згібнуты</u>** ў аковах…*”, дзе ў падкрэсленым слове перад суфіксам -*ну*- маецца гук [***б***], які ў сучаснай літаратурнай мове не вымаўляецца і не перадаецца на пісьме ў аднакаранёвых словах (*загінуць, згінуць*). Пастарайцеся здагадацца і запісаць, які зычны стаяў на месцы, адзначаным прочыркам, у кожным з наступных дзеясловаў. Дакажыце гэта прыкладамі аднакаранёвых слоў.

| **Дзеяслоў** | **Гук** | **Дзеяслоў** | **Гук** |
|---|---|---|---|
| вяр_нуць | | гля_нуць | |
| пырс_нуць | | закра_нуць | |
| вя_нуць | | зас_нуць | |
| та_нуць | | ускі_нуць | |

*Максімальная колькасць балаў – 4 (0,5 бала за кожны гук).*

**Заданне 7.** Запішыце па два прыклады вытворных адносных прыметнікаў разам са словамі, ад якіх яны ўтварыліся. Пры гэтым улічыце прапанаваныя фармальныя паказчыкі словаўтварэння прыметнікаў.

| **Суфіксы** | **Пары слоў** |
|---|---|
| *-н-* | *камень → каменны, бітум → бітумны;* |
| *-ан- (-ян-)* | |
| *-ов- (-ев-)* | |
| *-ск-* | |
| *-шн- (-ашн-)* | |
| *-льн-* | |

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 8.** Дакажыце, што ў словаўтваральным гняздзе з зыходным словам ***ляцець*** ёсць словы, утвораныя наступнымі спосабамі: 1) прыставачным, 2) суфіксальным, 3) прыставачна-постфіксальным, 4) бяссуфіксным, 5) складаннем асноў, 6) спосабам складання ў спалучэнні з суфіксальным.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*



Репозиторий ВГУ

**Заданне 9.** Запішыце як мага больш суфіксаў, якія выкарыстоўваюцца ў беларускай мове пры ўтварэнні асабовых назоўнікаў мужчынскага роду, а таксама па 2 назоўнікі, утвораныя пры дапамозе гэтых суфіксаў. Гл. узор да першага слова.

| **Суфікс** | **Назоўнікі** |
|---|---|
| 1. *-ак (-як)* | *асіл-ак, рыб-ак, мар-ак, бядн-як* |

*Максімальны бал – 5 (1 бал за 1 суфікс + 2 назоўнікі).*

**Заданне 10.** Падкрэсліце ў тэксце па 2 словы, марфемны склад якіх адпавядае наступным графічным схемам. Абазначце лічбамі, якой з трох схем гэтыя словы адпавядаюць.



Ляжаць на далоні зерні…
Не верне зямля іх?.. Ці верне?..
Чысценькія такія,
Дагледжаныя і сухія;
Іх аддаваць страшліва
Нават зямлі ўрадлівай.
А што, калі сонца не знойдзе
І промень воддаль іх пройдзе?..
А што, як у цёмных нетрах
Не хопіць для іх паветра?..
І яны, нібы рыба на беразе,
Задыхнуцца ў раллі?..
І не верце, бо нават у жменях,
Як жывыя, варушацца зерні…
І ў пальцы дзяўбуць расткамі,
У руках прарастаюць самі.
Расшчапіце хутчэй далоні –
Не трымайце жыццё ў палоне!

Я. Сіпакоў.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

**Заданне 11.** Абазначце ў кожным слове корань. Выпішыце пары аднакаранёвых слоў. Растлумачце, як называюцца карані, абазначаныя ў нявыпісаных словах.

Вадзянік, нізіна, вуліца, загарнуць, саліць, рэзаць, саліст, водны, сігаць, рэзкі, завулак, марскі, нізкавата, марыць, гаротны, дасягнуць.

*За кожную правільна выпісаную пару – 1 бал.*

**Заданне 12.** Запішыце *жаночыя* варыянты да прапанаваных мужчынскіх імён.

Узор: *Алесь → Алеся.*

| | |
|---|---|
| Ян → | Пятро → |
| Сцяпан → | Васіль → |
| Міхал → | Фёдар → |
| Павел → | Стафан → |

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

Рэпазіторый БГУ

**Заданне 13.** Выпішыце падкрэсленыя словы. Пісьмова вызначце іх марфемны склад і спосаб утварэння.

Гарыць агонь. Каля *зямлянкі* аб доме тужаць *землякі*, а маладыя *партызанкі* пякуць і сушаць *праснакі.* (П. Глебка)

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

## Тэма 5. Марфалогія. Граматычныя нормы назоўніка

**Пытанні**

1. Катэгорыя роду назоўнікаў. Адрозненні ў родзе назоўнікаў у беларускай і рускай мовах. Катэгорыя ліку назоўнікаў.
2. Назоўнікі 1-га скланення і рознаскланяльныя назоўнікі. Канчаткі назоўнікаў 1-га скланення і рознаскланяльных у Д., Т., М. скл.
3. Назоўнікі 2-га і 3-га скланенняў. Канчаткі назоўнікаў 2-га скланення м. р. адз. л. у Р. і М. скл.
4. Скланенне імёнаў, прозвішчаў і геаграфічных назваў. Нескланяльныя назоўнікі.

**Заданне 1.** Ці выпадкова ў наступным дыялогу рыфмуюцца рэплікі? Чым гэта можна ратлумачыць? Знайдзіце ў тэксце ўласцівыя беларускай мове формулы моўнага этыкету і граматычныя формы.

– Дзень добры, Кліму!
– Але, але, капаю гліну.
– Што ты, Клім, ужо аглух?
– Сам капаю, а не ўдвух.
– Ці не бачыў ты мае казы?
– Накапаў ужо тры вазы.
– Ці даўно ты стаў не чуць?
– Бывай, суседзе, здароў будзь!

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

**Заданне 2.** Якую памылку не заўважылі рэдактары “Збору твораў” У. Караткевіча ў наступным сказе:

*На бярвеннях дзяўчаты запелі пра вячэрнюю стому сваю.* (У. Караткевіч)

*За правільна выпісанае слова –1бал, за тлумачэнне –1 бал.*

**Заданне 3.** З наступнымі назоўнікамі складзіце па 2 словазлучэнні ці сказы, паставіўшы назоўнікі ў родным склоне адзіночнага ліку. У адным выпадку назоўнік павінен мець канчатак *-а,* а ў другім – *-у.*

Лістапад, дуб, народ, пад’езд.

*Максімальная колькасць балаў – 4 (за адно правільна запісанае словазлучэнне ці сказ – 0,5 бала).*

**Заданне 4.** Якія нормы літаратурнай мовы парушаны ў наступным сказе?

*Вышыня сяквоі дасягае сто пяцьдзесят метраў, а дыяметр пятнаццаць метраў.*

1. Арфаграфічныя і граматычныя. 2. Пунктуацыйныя. 3. Моўна-стылістычныя.

*Максімальная колькасць балаў – 2.*

**Заданне 5.** Прытрымліваючыся рыфмы, устаўце прапушчаныя словы ў вершы С. Гаўрусёва. На прыкладзе якіх назоўнікаў можна праілюстраваць асаблівасці марфалогіі беларускай мовы ў параўнанні з рускай?

Што там бялеее – ранні снег ці гусі селі на ….? Праймае грудзі халадок, як быццам босы стаў на …. . Плячом апёршыся на …., апошні ліст раняе дуб. І сівер – з ярасці …. – малоціць лёд ва ўсе цапы.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 6.** Прачытайце ўрывак з твора А. Бязлепкінай “Ульяна, альбо Нарадзі ў сабе гейшу”. Запішыце, на якую граматычную памылку звярнуў увагу прафесар і чаму?

– Ульяна, Вы ўжо самі зразумелі, што пісаць – гэта праца. І цяжкая праца… Я не магу сказаць, што Вы непісьменная, Вы, хутчэй, няўважлівая. Ну што гэта за назва “Ноч на бігудзях”?

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

**Заданне 7.** Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.

Железнодорожная насыпь –…; неправильная дробь –…; третья перепись –…; некачественный гонт –…; древнерусская летопись –…; едкая арь –…; кислый щавель –…; гречневая крупа –…; пойти за водою – … ; жениться на студентке –…; пойти за водою –…; поблагодарить брата – …; сердечное спасибо –…; старше сестры –….

*Максімальная колькасць балаў – 7.*

**Заданне 8.** Запішыце словы па-беларуску, дапасаваўшы да іх прыметнікі.

Живопись –…; риск –…; паводок –…; стебель –…; бровь –…; ежевика –…; блюдце –…; земляника –…; гусь –…; накипь –…. .

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 9.** Падкрэсліце ў кожным радзе *чацвёртае лішняе* слова. У дужках коратка растлумачце свой выбар.

1) вароты, азёры, дамы́, сталы;

2) задавака, дзяўчына, задзіра, валацуга;



Репозиторий ВГУ

3) радасць, цень, ростань, восень;

4) Сочы, Тбілісі, Осла, Місісіпі.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

## Тэма 6. Прыметнік. Лічэбнік. Займеннік. Іх граматычныя нормы

**Пытанні**

1. Прыметнік як часціна мовы. Разрады прыметнікаў па значэнні. Асаблівасці ўтварэння ступеней параўнання прыметнікаў. Прыналежныя прыметнікі, іх утварэнне і ўжыванне.

2. Лічэбнік як часціна мовы. Разрады лічэбнікаў па значэнні і структуры. Скланенне і правапіс лічэбнікаў розных разрадаў. Сінтаксічная сувязь лічэбнікаў з назоўнікамі.

3. Скланенне і правапіс займеннікаў. Асаблівасці ўжывання займеннікаў у беларускай мове.

**Заданне 1.** Адзначце сказы з парушэннем граматычнай нормы ва ўжыванні ступеней параўнання прыметнікаў. Запішыце гэтыя сказы правільна.

1.Этыкетная паслядоўнасць прывітанняў: маладзейшы вітае старэйшага, мужчына – жанчыну, маладзейшы па чыну – старэйшага.

2. На чале роду стаяў старэйшына – самы стары і паважаны прадстаўнік роду.

3. Самы старэйшы кенійскі школьнік, 88-гадовы Кімані Нганга Маруге, вымушаны быў пакінуць парту і адправіцца ў дом састарэлых.

4. Самы стары храм Гародні – Барысаглебскую царкву XII стагоддзя, якую звычайна называюць Каложскай царквой, або проста Каложай, чакае рэстаўрацыя і адбудова.

5. Найвышэйшых паказчыкаў па намалоце збожжа дасягнулі Іваноў Алег Анатольевіч, старэйшы камбайнер, і Паграбецкі Аляксей Леанідавіч, якія намалацілі 1201,9 тоны збожжа, убралі 416 гектараў.

*За кожны правільна запісаны сказ – 1 бал.*

**Заданне 2.** Знайдзіце словазлучэнні *з граматычнымі памылкамі* і запішыце пад іх нумарамі выпраўленыя варыянты.

1. Каля двух цэлых і адной трэцяй бочкі. 2. Тры вялікія рыбіны. 3. З чатырыста пяццюдзесяццю трыма скрынкамі. 4. З дзвюмастамі двума малюнкамі. 5. У двухстах сарака дзвюх тонах. 6. У дзвюх цэлых і дзвюх дзясятых грама. 7. Адзін цэлы і тры сотыя кілаграма. 8. Да чатырох тысяч дзвюхсот дзевяноста дзвюх тон. 9. З паўтары тысячамі рублёў. 10. Дзве цэлыя і сем дзясятых шклянкі. 11. Паміж дзвюмястамі трыццаццю двума вучнямі.

*За кожнае правільна запісанае словазлучэнне – 1бал.*

**Заданне 3.** Выпішыце з тэксту лічэбнікі і запішыце іх словамі ў творным склоне. Вызначце, якімі часцінамі мовы з’яўляюцца падкрэсленыя словы.

Колькі стралялі зуброў у Белавежы!

Восень, 27 верасня. 1752 год. Кароль Аўгуст ІІІ палюе. Разам са сваёй жонкай – вялікай каралеваю. У гэты дзень яе вялікасць каралева забіла 20 зуброў і прачытала каля 50 старонак сентыментальнага рамана.

1860 год. Таксама верасень. Палюе цар Аляксандр ІІ. З усёй пушчы пад яго стрэлы было сагнана 117 зуброў, 100 зайцаў, 3 ласі, 23 дзікі, 36 коз, 14 ланяў, 17 ваўкоў, 15 ліс, 14 барсукоў. Усяго 339 галоў.

Але зубр, нягледзячы на здзек і ганьбаванне, не пакінуў сваю Белавежу. Вучоныя нават зрабілі вывады, што пушча захавалася толькі таму, што ў ёй былі зубры, а зубры захаваліся толькі таму, што была пушча. *(Паводле Я. Сіпакова)*

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 4.** Прывядзіце як мага больш фразеалагізмаў, у склад якіх уваходзяць лічэбнікі.

*За кожны правільна прыведзены фразеалагізм – 1 бал.*

**Заданне 5.** Выпішыце нумары сказаў *з граматычнымі памылкамі* ва ўжыванні займеннікаў.

1.Чужое возьмеш – сабе на карысць не пойдзе. 2. Я цябе такое раскажу, што ў цябе адпадзе ахвота пярэчыць. 3. Не стаў сабе дачасна помнік і ў бяссмерце не спяшы, лаві не ўласнай славы промні, а сонца кожнае душы. *(П.Панчанка)* 4. Каля самога плоту раслі крапіва і чыстацел. 5. Мне хацелася не раз самаму́ ўзляцець у неба. 6. Сусед раіў Андрэю пагаварыць з сынам, але ён яго не паслухаўся. 7. Падышоў к са́маму берагу і зірнуў уніз. 8. Прыдбаў сябе ў ”Букінісце” рэдкую кнігу. 9. Ніхто не зробіць горш табе, чым сам сабе. 10. Па падворку хадзіў ніхто іншы, як сын. 11. Каля берага ракі стаяў разложысты дуб. Калі ён параўняўся з ім, то пачуў брэх сабакі. 12. Госці з’ехалі, дык не з кім нават і пагаварыць. 13. Які-ніякі, а ўсё-такі свой дом. 14. Ідучы ў войска, сын папрасіў маму не выкідваць свае сшыткі. 15. Табе, шчодры сялянскі стол, хочацца сказаць ласкавае слова. (Я. Сіпакоў) 16. Калі на галінку пераскоквала вавёрка, з яе сыпаўся снег.

*За кожны правільна выпісаны нумар сказа – 0,5 бала.*

**Заданне 6.** Прывядзіце як мага больш прыкладаў прыналежных прыметнікаў, якія выступаюць у ролі якасных.

*За кожнае правільна прыведзенае слова – 1 бал.*

Репозиторий ВГУ

**Заданне 7.** Удзельнікам школьнай алімпіяды па беларускай мове быў прапанаваны для перакладу наступны тэкст на рускай мове.

*Человеку важно знать свои корни – отдельному человеку, семье, народу. Тогда и воздух, которым мы дышим, будет целебен и вкусен, дороже будет взрастившая нас земля и легче будет почувствовать назначение и смысл человеческой жизни. Давайте же будем помнить об этих корнях. (В. Песков)*

У аднаго вучня атрымаўся такі пераклад:

*Чалавеку важна знаць свае корні – асобнаму чалавеку, сям'е, народу. Тады і паветра, якім мы дышам, будзе цалебна і смачна, даражэй будзе ўзрасціўшая нас зямля і лягчэй будзе спасцігнуць прызначэнне і сэнс чалавечага жыцця. Давайце ж будзем памятаць аб гэтых карнях!*

Уявіце сябе ў ролі настаўніка і выпраўце дапушчаныя памылкі, моўныя недахопы, запісаўшы тэкст правільна. На прыкладзе якіх слоў і словазлучэнняў можна праілюстраваць адметныя рысы беларускай марфалогіі? Якія сказы (часткі сказаў) з'яўляюцца аднасастаўнымі? Вызначце іх тыпы.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 8.** Выпішыце займеннікі і ўкажыце іх разрады.

Вітаю працай кожны дзень і адчуваю, што з гадамі мне хочацца любіць людзей усё мацней, усё адданей. Усе яны – мая радня. І з імі помню я заўсёды: народ мой вечны, як зямля, я – зерне ў глыбіні народа. (Л. Дайнека)

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

**Заданне 9.** У якіх сказах словазлучэнні з займеннікам *самы (самая, самае)* выражаюць '*меру, ступень праяўлення якасці, прыметы дзеяння*'.

1. Настала часіна другая, усё родніцца сёння хутчэй, а самая радасць людская, што сэрцы да сэрцаў бліжэй. (*П. Броўка*)

2. Вінгеля мы ўбачылі ў самай гушчыні кустоў. (*К. Чорны*)

3. Гарохам сыпле Богут словы, а самы тон яго прамоў то памяркоўны, то суровы. (*Якуб Колас*)

4. "Адтуль, адтуль заходзь – там самая рыба ходзіць!" – радзіць дзед. (*М. Лынькоў*)

5. Другая частка песні была спакайнейшая, але самы спеў яшчэ мацней хапаў за сэрца. (*Якуб Колас*)

**А)** ва ўсіх сказах; **Б)** 1, 4; **В)** 2, 3, 4; **Г)** 3, 5; **Д)** 1, 4, 5.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

**Заданне 10.** У якіх сказах сустракаюцца словазлучэнні з займеннікам *другі* ў значэнні '*іншы*'.

1. Другі рабочы Сцёпкаў дзень пачаўся не вельмі ўдала.



Репозиторий ВГУ

2. Тут ужо Мудрэйка спусціў нос і пастараўся пусціць гаворку ў другі бок.

3. І зробіць яшчэ Сцёпка такія выбрыкі ў паветры, што і артыст другі пазайздросціць.

4. Заняткі ў школе пачаліся другога верасня.

5. Другі баран – ні “бэ” ні “мя”, а любіць гучнае імя.

**1)** ва ўсіх сказах; **2)** 1, 3, 4; **3)** 1, 2; **4)** 2, 3, 5; **5)** 4, 5.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

## Тэма 7. Дзеяслоў і яго граматычныя формы

**Пытанні**

1. Дзеяслоў як часціна мовы. Граматычныя катэгорыі і формы дзеяслова. Спражэнне дзеясловаў. Правапіс асабовых канчаткаў.

2. Дзеепрыметнік як неспрагальная дзеяслоўная форма. Асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў у беларускай мове.

3. Дзеепрыслоўе як нязменная форма дзеяслова. Памылкі пры ўтварэнні і ўжыванні дзеепрыслоўяў у сказах.

**Заданне 1.** Выпраўце памылкі ва ўжыванні дзеясловаў у наступных сказах. Запішыце сказы правільна.

1. Куды вы бяжыце? 2. Так не праб’ецеся. 3. Навошта ўеце вяроўку? 4. Трэба адмерыць 5 метраў стужкі. 5. Прыходзьце, як толькі прачнецеся. 6. Скажэце, каб прыходзілі. 7. Як вы іх распазнаеце? 8. Ідзем мы ўчора па лесе і раптам бачым воўчыя сляды. 9. Мы вядзем з сабой дзяцей. 10. З якой мэтай іх бярэце з сабой? 11. Як толькі паклічу – адразу адгукнецеся. 12. Перад пачаткам новага навучальнага года мы абавязкова падстрыжэмся.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

**Заданне 2.** Запоўніце табліцу.

| 2-я асоба, адз. лік | 1-я асоба, мн. лік | 2-я ас., мн. лік |
|---|---|---|
| | *перададзім* | |
| *ачнешся* | | |
| | | *сватаецеся* |
| | *нападзём* | |
| *глядзіш* | | |
| | | *застаняцеся* |
| | *ляцім* | |
| *клянешся* | | |

*Максімальная колькасць балаў – 4.*



Репозиторий ВГУ

**Заданне 3.** Выпішыце нумары словазлучэнняў з формамі дзеепрыметнікаў, якія не адпавядаюць нормам беларускай мовы.

**1)** працягваемая гутарка; **2)** уважліва слухаючы сын; **3)** атрымаўшыеся малюнкі; **4)** уцалелы кавалак лесу; **5)** змолатае зерне; **6)** сурова насупленыя бровы; **7)** парослыя мохам купіны; **8)** заінетыя дрэвы; **9)** зачырванеўшаяся ад марозу дзяўчынка; **10)** заросшы травою ручай; **11)** засмажанны кавалак; **12)** асветляныя сонцам паляны; **13)** засыплены лісцем; **14)** куплены на ўласныя грошы.

*За кожны правільна выпісаны нумар словазлучэння – 0,5 бала.*

**Заданне 4.** Выпішыце нумары сказаў з памылкамі ва ўжыванні ці ва ўтварэнні дзеепрыслоўяў. Вусна пракаменціруйце, у чым заключаецца кожная памылка.

**1.** Прыбегшы ў спякотны дзень да ракі, нельга разгарачанаму адразу кідацца ў ваду. **2.** Не чытаўшы кніг, не вучыўшы ўрокаў, не спадзявайся на поспехі ў навуцы. **3.** Слухаючы выступленне спявачкі, у людзей на сэрцы станавілася лягчэй. **4.** Было так ціха, што чуваць было, як недзе, зашыўшыся ў траву, цвірчэў конік. **5.** Ад'язджаючы ў горад і надоўга развітваючыся з роднымі мясцінамі, у мяне моцна заные ў сэрцы, балюча зашчыміць у грудзях. **6.** Развітваючыся з гаспадаром, госці адразу паехалі ў горад. **7.** Было чуваць, як плешча, гуляючы ў вадзе, рыба, як злосна гудуць, пралятаючы блізка каля агню, чорныя рагатыя жукі. **8.** Паціху дагараўшы, дровы зрэдку ўспыхвалі дымком. **9.** Прыехаўшы ранкам у лес па грыбы, там было ўжо светла. **10.** Дайшоўшы да свайго старога селішча, не маглі, каб не зазірнуць на яго. **11.** Ён ціха, нерухома ляжаў, з асалодай адчуваючы, як цела прыемна ные ад стомы. **12.** Успомніўшы каля дошкі даўно прачытаны твор, вучань хмурыў бровы, моршчыў лоб і чухаў патыліцу. **13.** Тут, ля возера, яго душа нібыта выпроствалася і замірала, прагнучы толькі цішыні і прыгажосці. **14.** Кучаравая вішня ўжо адцвітала, шчодра сыпаўшы на зямлю свае белыя пялёсткі.

*За кожны правільна выпісаны нумар сказа – 0,5 бала.*

**Заданне 5.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Якімі сродкамі перакладу дзеепрыметнікаў на беларускую мову вы карысталіся?

Одуванчики

Солнце ушло в черные глухие дымящиеся тучи, и пятый день беспрерывно шли дожди, и было холодно, как осенью. Оранжевые на солнце одуванчики прикрылись длинными узкими листьями и теперь целый день стояли, словно в пальто с поднятым воротником, раскачиваемые ветром, вечно заплаканные и унылые.

Неужели пройдет жизнь, и вот так, под дождем, станут седыми одуванчики, и ветер развеет их в прах, и останутся в высокой траве только

Репозиторий ВГУ

твердые белые костыльки как память, что был на свете золотой одуванчик и не успел в жизни ничего увидеть? (Б. Ямпольский)

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

**Заданне 6.** Словы якой часціны мовы адсутнічаюць у прапанаваным тэксце?

Хай гавораць, што нібыта
Біты варты двух нябітых;
Я па вопыту здабытым
Раю быць табе не бітым. (А.Александровіч)

*Максімальная колькасць балаў – 2.*

## Тэма 8. Словазлучэнне. Просты сказ

**Пытанні**

1. Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Віды сувязі слоў у словазлучэннях. Асаблівасці словазлучэнняў з дапасаваннем і кіраваннем у беларускай мове ў параўнанні з рускай.
2. Двухсастаўны сказ, яго граматычная аснова. Аднасастаўныя сказы, іх тыпы.

**Заданне 1.** Знайдзіце памылкі ў пабудове словазлучэнняў. Запішыце словазлучэнні правільна.

Працаваць па вечарам, хворы сэрцам, брат маладзей мяне, пісаць па адрасе, альбом па маляванню, спазніцца з-за дажджу, дзякаваць бацькоў, два вялізных возера, у трох кроках ад мэты, падысці к дубу, дбаць за дзяцей, дом у тры паверхі, пачціві да старых, турнір па тэнісу, імунітэт на хваробу, у мэтах паляпшэння вучобы.

За *кожнае правільна запісанае словазлучэнне – 0,5 бала.*

**Заданне 2.** Запішыце, якімі членамі сказа з'яўляюцца выдзеленыя словы, вызначце іх від.

| Сказ | Член сказа |
|---|---|
| ***Дай слова***, што абавязкова прыедзеш. | |
| ***Дай сказаць*** мне толькі некалькі слоў. | |
| ***Дай лейцы***, я дапамагу. | |
| ***Дай напішу*** гэта на дошцы. | |
| ***Дай згоду*** *на ўдзел у спаборніцтвах.* | |

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Репозиторий ВГУ

**Заданне 3.** Устанавіце адпаведнасць паміж сказамі і іх тыпамі. Адказ запішыце літарамі і адпаведнымі лічбамі, напрыклад: **А 6; Б 1…**

| | |
|---|---|
| **А.** Знайсці падкову **—** шчасце. | **1.** Абагульнена-асабовы |
| **Б.** Кменам, і смажанай рыбай**,** і ветрам падзьмула з гары. | **2.** Назыўны (намінатыўны) |
| **В.** Над полем цішыня і золак. | **3.** Пэўна-асабовы |
| **Г. Г.** Збіралі толькі добрае шчаўе і заечую капусту | **4.** Няпэўна-асабовы |
| **Д.** Люблю цябе**,** лес**,** за тваю чалавечую шчодрасць. | **5.** Безасабовы |
| **Е.** Вось і Гарынь**,** глыбокая**,** шырокая**,** імклівая. | **6.** Двухсастаўны |
| **Ж.** Выбірай нявестку не ў карагодзе, а на агародзе. | **7.** Інфінітыўны |

*Максімальная колькасць балаў – 7.*

**Заданне 4.** Вызначце назыўныя сказы, выкарыстаныя Якубам Коласам у радках з верша “Песняй вітаю я вас”. Пастаўце і запішыце лічэбнік, які абазначае колькасць назыўных сказаў, у форме творнага склону.

Скінуты межы, свет разгароджан –
Далеч, бязмежны прастор.
Яснае заўтра….

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

**Заданне 5.** Прачытайце наступны сказ: *Дождж хутка скончыцца.*

Пры дапамозе якіх сінтаксічных сродкаў можна паказаць адносіны гаворачага да зместу таго, пра што гаворыцца ў сказе?

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

**Заданне 6.** Вызначце характар структурных і семантычных адрозненняў для наступных пар сказаў.

1. Шмат каму ўспомніцца глыбіні марской таемны холад. – Слоў не хочацца кідаць на ўзвей-вецер.

2. Разгалістае зялёнае дрэва ўяўляецца мачтай. – Пастуху салодка спіцца на траве-пярыне.

3. Хіба дзеду сівому і ўспомніцца глыбіні рачной дзіўны свет. – Ой, як ціха пяецца пра лясок невысок, пра Марусіна сэрца і яе паясок.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

Рэпазіторый ВГУ

**Заданне 7.** Адзначце, які(я) з прыведзеных прыкладаў адпавядае(юць) наступнаму азначэнню: *"Сказ, у якім выражаецца значэнне павіннасці, неабходнасці, немагчымасці, непазбежнасці, пажаданасці, мэтазгоднасці дзеяння ці меркаванне адносна яго ажыццяўлення".* Вызначце тып гэтых сказаў.

| Сказ | Тып сказа |
|---|---|
| 1. Паслухаць бы драздоў світанне ў час ружовага світання. | |
| 2. Пахам мядовым дыхнула ад дрэў. | |
| 3. На граніцы паласу барануюць, нібы ў полі. | |
| 4. Нам пройдзеных дарог не перамераць і нанава нікому не прайсці. | |
| 5. Там ліры гук і посвіст косаў злучу ў адзін нячутны хор. | |

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

**Заданне 8.** Запішыце, якім членам сказа з'яўляюцца выдзеленыя курсівам словы і ў якім склоне яны стаяць.

1. Гарадскія *бібліятэкі* павінны забяспечваць усім неабходным спецыяльныя базы кніжнага гандлю.

2. *Гэта* – літаратурны музей народнага паэта Беларусі Янкі Купалы.

3. У конкурсе юных музыкантаў першы прыз атрымала *ўдзельніца* Кацярына Свірыдава.

4. *Карэджыа* называюць заснавальнікам пармскай школы жывапісу Антоніа Алегры.

5. Страшэнны штукар і *свавольнік* гэты Нёман.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

## Тэма 9. Складаны сказ

**Пытанні**

1. Складаназлучаныя сказы, сінтаксічныя адносіны і знакі прыпынку ў іх.

2. Злучнікі і злучальныя словы ў складаназалежных сказах. Сінтаксічныя адносіны і віды даданых частак у складаназалежных сказах.

3. Бяззлучнікавыя складаныя сказы, сінтаксічныя адносіны і знакі прыпынку ў іх.

Репозиторий ВГУ

4. Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі, іх віды і знакі прыпынку ў іх.

**Заданне 1.** Запішыце сказы, якія адпавядаюць прыведзеным схемам. Укажыце тыпы гэтых сказаў.

**Схема 1**. [Здавалася], (нібы…).
**Сказ:** ______________________________________________
**Тып:** ______________________________________________

**Схема 2**. […], (дарма што…).
**Сказ:** ______________________________________________
**Тып:** ______________________________________________

**Схема 3**. […], (ажно…)
**Сказ:** ______________________________________________
**Тып:** ______________________________________________

**Схема 4.** […усё], (што…).
**Сказ:** ______________________________________________
**Тып:** ______________________________________________

**Схема 5.** […], (ці…).
**Сказ:** ______________________________________________
**Тып:** ______________________________________________

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 2.** Адзначце нумары сказаў з даданымі дзейнікавымі часткамі.

1. Зімовыя мяцеліцы, што заносілі снегам шашу, супакоіліся.
2. Тады здавалася, што ў яловы гушчар заплыў і застаўся там назаўсёды густы восеньскі туман.
3. І настаў такі час, што пралітыя слёзы перапоўнілі неба і паліліся назад на зямлю.
4. Тое, што бацька вяртаецца з нейкімі навінамі, крыху трывожыла Макарку.
5. І раптам яму ўявілася, якім страшным, нават жудасным здаваўся б ён з касою кветкам.
6. У яго сэрцы жыве родная мелодыя як успамін аб той зямлі, што ўзгадавала яго.
7. На душы было радасна, што кожны крок набліжае яго к роднаму дому.
8. Усё, што нагадвае пра дзяцінства, чалавек зберагае ў душы і перадае дзецям сваім.

Репозиторий ВГУ

9. Здзіўляюся ўсмешцы немаўляці, што цмокае губамі і гудзе, і прыгажосці маладзенькай маці, што прытуліла сына да грудзей.

10.Успамінаюцца сустрэчы і самыя шчаслівыя часы, што і цяпер здаюцца нам вясною.

11. І будзе відаць у сусвеце, як неба святкуе Купалля пару на трыццаць другім маім леце.

12. Тое, што Ефрасіння Полацкая зрабіла для асветніцтва роднай зямлі ў сваю эпоху, яднае стагоддзі.

*За кожны правільна вызначаны нумар – 1 бал.*

**Заданне 3.** Запішыце сказы, замест кропак устаўце патрэбныя злучнікі ці злучальныя словы, пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Вызначце віды дадaных частак – дзейнікавыя ці выказнікавыя (дапаўняльныя ці азначальныя).

1. … цураецца радні … цураецца сяла той як птах без вышыні той як хата без цяпла.
2. Чамусьці сёння цішыня такая … сесці хочацца і патужыць.
3. Як добра ... ва ўсе вякі жывуць на свеце дзівакі.
4. Зімой згодзіцца … ўлетку родзіцца.
5. … згублена лёс не вяртае.
6. Не збярэ жнівом ураджаю … вясну маладую праспіць.
7. … карэнне такое і насенне.
8. … народ такі й паэт. … паэт такія й людзі.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

**Заданне 4.** Дапоўніце часткі наступных прыказак і прымавак, пабудаваных па схеме складаназалежнага сказа. Дайце структурную характарыстыку адноўленым часткам.

| | | |
|---|---|---|
| 1. Дзе пасееш густа, | | |
| 2. Няхай з грэчкі будзе мак, | | |
| 3. Дзе гаспадар ходзіць, | | |
| 4. Дзе дровы сякуць, | | |
| 5. Хто не ідзе, | | |

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 5.** Вусна ўзнавіце знакі прыпынку. Запішыце сказы, якія адпавядаюць схемам:

а) [ ] – [ выражае дадатковае паведамленне ];

Репозиторий ВГУ

б) [ ] : [ паясняе, удакладняе слова ў першай частцы];
в) [ ] : [ дапаўняе першую частку].

1. На зямлю сырую ціха ночка пала бляскам-дрыгаценнем зорка замігала.

2. Бывае так паміж клапотаў, між працы тлумных вечароў агорне часам адзінота.

3. Агнявыя валаконцы ткуцца ў шоўк чырвоны гэта хмаркі ладзяць сонцу і зямлі карону.

4. Спадала гарачыня гусцелі фарбы наваколля духмяна пахла лугавой травой.

5. Як зманьвае, як спакушае перажытае як хочацца скупануцца ў светлай і жывой вадзе былых дзён!

6. Біяграфія ў песні маёй і ў мяне адна пад дзіравай страхой гадаваліся я і яна.

7. У Лынькова было яшчэ адно, як цяпер кажуць, хобі ён любіў фатаграфаваць праз агонь.

8. Цяпер я з гонарам магу сказаць нішто так не ўзвышае, не падымае на п’едэстал духоўнай годнасці чалавека, як мастацкая літаратура.

9. Цёплым крылом махне вясна расцвітаюць яблыні зноў.

10. Іван Мележ сцвярджаў усёй сілай свайго таленту гэтыя людзі не для паказу вам жывуць, не дзеля экзатычнай забаўкі.

*За кожны запісаны сказ, які адпавядае схеме – 1 бал.*

**Заданне 6.** Прывядзіце прыклады бяззлучнікавых складаных сказаў у адпаведнасці са схемамі. Расстаўце патрэбныя знакі прыпынку.

1) [ ] [ хуткая змена падзей ];

2) [ ] [супастаўленне з’яў, падзей ] ;

3) [ ] [ вынік ];

4) [ ] [ прамое пытанне];

5) [ ] [ неадпаведнасць зместу];

6) [ ] [тлумачэнне].

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

**Заданне 7.** Выберыце правільны варыянт пастаноўкі знакаў прыпынку ў наступным сказе.

*Толькі калі падрос я зразумеў чаму мама так моцна любіла вясну з вясной у яе была звязана надзея на ўрадлівае лета рупную восень і негалодную зіму.*

1. Працяжнік, коска, працяжнік, коска.

2. Коска, двукроп’е, працяжнік, коска.
3. Працяжнік, коска, двукроп’е, коска.
4. Коска, коска, двукроп’е, коска.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

**Заданне 8.** Зрабіце поўны сінтаксічны разбор складанага сказа.

*Перад самымі вачыма Верасоўскага ціха сам сабою як усё роўна яго нехта зачапіў пагойдваўся рамонак які формаю нібы паўтараў сонца і гэты рамонак абуджаў у ім нейкі невыразны ўспамін але ён спрасоння не хацеў дашукваацца яго.* (Я. Сіпакоў)

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 9.** Расстаўце патрэбныя знакі прыпынку. Зрабіце поўны сінтаксічны разбор сказаў.

**1.** Не самае важнае дзе ён жыў і дзе пісаў свае творы. Але важна для нас тое што ён усё сваё жыццё шчымліва спавядаўся ў любові да роднай зямлі якая яго нарадзіла якая ўзгадавала яго сваімі песнямі і казкамі. Ён казаў што ў казках і песнях беларусаў схавана ўся прыгажосць зямлі радаваўся што беларуская мова “найбольш гарманічная і найменш перакручаная з усіх славянскіх дыялектаў” і што “няма народа чысцейшага чым нашы калтуністыя беларусы”. *(Янка Сіпакоў пра Адама Міцкевіча)*

**2.** Славу гораду як і зямлі робяць славутыя людзі. У гэтым сэнсе Гародні пашэнціла ў ёй жыло нямала выдатных славутых людзей і сярод іх наш першы інтэлігент у літаратуры тонкі і трагічны Максім Багдановіч.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 10.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Расстаўце ў сказах патрэбныя знакі прыпынку.

Мифы Древней Греции

Легенды и предания сложенные древними греками создавались в те далёкие времена когда люди только начинали вглядываться в окружающий их мир только приступали к его исследованию и объяснению.

Одну за другой мешая правду и вымысел придумывали и рассказывали друг другу удивительные истории о том как возник мир и что его наполняет почему по бурному морю бегут белые барашки-волны почему люди бывают то смелыми и мудрыми то глупыми и трусливыми откуда берётся отголосок в лесу точно повторяющий в тишине каждое громко сказанное слово.

Как живые глядят и сейчас на нас из этих древних преданий слагавшие их тысячелетия назад люди простодушные доверчивые любопытные и по-своему мудрые. (По Л.Успенскому)

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

Рэпазіторый ВДУ

## Тэма 10. Тэкст. Культура мовы. Мова і грамадства

**Пытанні**

1.Стылі мовы. Стылёвыя адзнакі і моўныя сродкі тэкстаў розных стыляў.

2.Тыпы маўлення. Апавяданне, апісанне і разважанне як тыпы маўлення.

**Заданне 1.** Адрэдагуйце наступныя тэксты, зрабіўшы іх моўна-стылістычную праўку. Вызначце ў іх стыль і тып мовы.

*Варыянт 1.*

Азёрны край.

Нямнога знойдзецца ў Беларусі месц, дзе столькі азёр. На Браслаўшчыне яны займаюць 22,3 тысячы гектараў. Іх тут звыш трыццаці. Браслаўскія азёры і акаляючы іх напаўторны рэльеф з’яўляюцца каштоўнейшым багаццем нашай рэспублікі.

На возеры адзінаццаць зялёных вострваў. Надводная расліннасць займае каля шасці працэнтаў плошчы возера. Шмат камыша, трасніку, ёсць зараснікі рдзесту. А колькі рыбы! Шчука так і ўецца па роўнай вадзяністай гладзі. У Дрывяты ўпадае пяць рэк, а выцякае адна – Друйка.

Браслаўскія азёры патрабуюць к сабе надзвычай уважлівых адносін, іх абавязкова трэба захоўваць у тым стане, у якім яны знаходзяцца зараз. Некаторыя азёры ўжо ўзяты пад ахову. На поўначы ад Браслава створан заказнік. Вызначана вялікая зона для адпачынка.

*Варыянт 2.*

Старажытная кніга

Якой даўней была кніга? У старажытныя часы яна была зусім не падобная на нашы. На чым толькі ні пісалі старажытныя продкі! На ўсім, што больш ці менш было здатным для пісьма: бяросце, камнях, гліністых плітках, цаглінках таўшчынёю ў два пальца. Сотні такіх цаглінак і ўтваралі старадаўнюю кнігу.

*Варыянт 3.*

Вясёлыя пацехі Масленіцы

У прошлую нядзелю гарадакчане і госці г. Гарадка святкавалі Масленіцу. І хоць зямля пакуль не спяшаецца абуджацца ад зімовай спячкі, традыцыйнае гуканне вясны, згодна народным абрадам і традыцыям, – ні што іншае, як зварот да вышэйшых прыродных сіл даравацъ простаму чалавеку працы дабрабыт і багаты ўраджай.

*Максімальная колькасць балаў за 1 тэкст – 5.*

Репозиторий ВГУ

**Заданне 2.** Адзін з беларускіх паэтаў у сваім вершы сказаў: *“Адценне слоў – не глупства...”* Хто гэты паэт? Калі памятаеце, прадоўжыце верш. Напішыце невялічкі філалагічны абразок (эцюд, артыкул), у якім павінна быць дадзена Ваша асабістая інтэрпрэтацыя прыведзеных слоў.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

**Заданне 3.** Адзін з вядомых сучасных беларускіх паэтаў пісаў: *“І калі б была мая воля на тое – пачаў бы я азбуку менавіта з літары ...: як і ўсё на зямлі, усё ў нас пачынаецца з ...”*. Хто гэты паэт? Пра якую літару ён гаворыць? Калі памятаеце, закончыце выказванне. Дайце сваю асабістую інтэрпрэтацыю прыведзеных слоў.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 4.** Вядомы беларускі пісьменнік А. Разанаў пісаў: *“Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны твор, і гэты твор – мова”.* Растлумачце сэнс выказвання. Дайце сваю асабістую інтэрпрэтацыю прыведзеных слоў.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 5.** Якое слова ва ўсходнеславянскай (старажытнарускай) мове абазначала 10 000?

*За правільны адказ –2 балы.*

**Заданне 6.** Выкарыстаннем якіх моў характарызавалася этнамоўная сітуацыя на Беларусі ў ХУІ – ХУІІ стст? Назавіце вядомыя Вам пісьмовыя помнікі, створаныя на беларускай мове ў гэты час.

*За правільны адказ на пытанне – 2 балы, за кожную правільна прыведзеную назву пісьмовага помніка – 0,5 бала.*

**Заданне 7.** Да наступных старажытных слоў, якія ўжываліся ў беларускай мове на розных этапах яе гістарычнага развіцця, падбярыце лексічныя адпаведнікі з сучаснай беларускай мовы.

Абецадло, адамантъ, головникъ, кгвяздаръ, листь, ловы, мешкати, мыто, наследокъ, ростропный.

*За адно правільна падабранае слова – 0,5 бала.*

**Заданне 8.** Перакладзіце фрагмент з пасляслоўя Францыска Скарыны да кнігі “Руф” на сучасную беларускую мову.

*Доконана ест книга Руф, выложена и вытеснена повелением и працею ученаго мужа Франциска Скорины из славного града Полоцка, в лекарстве и в науках доктора, у великом месте Празском тысещи пятистех и девятинадесяти Богу в Троици единому и матери его со всими святыми ко чти и людем посполитым к науце.*

*Максімальная колькасць балаў – 5.*



Репозиторий ВГУ

**Заданне 9.** Запоўніце пропускі ў наступных выказваннях.

**1**. Галоўным прадстаўніком беларускай літаратуры эпохі Рэфармацыі быў…. У …. годзе ў Нясвіжы ён выдаў…. Асветнік абгрунтаваў неабходнасць перакладу…. на народныя мовы.

**2.** Вядомым пісьменнікам, кнігадрукаром і перакладчыкам эпохі Рэфармацыі быў ….Ён працягнуў скарынаўскія ідэі ў перакладзе …. на беларускую мову. Асветнік заклікаў шанаваць …. і клапаціўся пра….

*Максімальная колькасць балаў за 1 выказванне – 4.*

## КОМПЛЕКСНЫЯ ЗАДАННІ ДА ЗАЛІКУ

### Варыянт 1

*Прачытайце тэкст і выканайце заданні да яго.*

Малая радзіма! Што гэта такое? Адкуль і дакуль яе межы?

Вось пра гэта я і пачаў думаць, ступіўшы на зямлю сваёй малой радзімы, сваёй палескай вёскі. Па-мойму, яна – гэта абсяг нашага дзяцінства. Іншымі словамі, тое, што могуць бачыць дзіцячыя вочы і што прагне ўвабраць у сябе чыстая, шчырая душа. Гэта там, дзе душа ўпершыню здзівілася, узрадавалася і аж зайшлася ад шчасця і дзе ўпершыню засумавала або перажыла сваё першае ўзрушэнне.

Ціхая вуліца, матчын агародчык, які запрашае, цягне да сябе, каб пачаставаць самымі смачнымі вясковымі ласункамі. Потым – сад, дзе вісне з яблынь цыбулевымі пляцёнкамі галлё з чырванабокімі яблыкамі. За садам – духмяны абшар поплава…

Малая радзіма – гэта тое, што на ўсё жыццё адорвае нас крыламі натхнення.

Паводле М. Капыловіча.

**Заданні**

1. Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце сваю думку.
2. Назавіце ў тэксце абстрактныя назоўнікі са значэннем псіхаэмацыянальнага стану, пабудуйце з імі сінанімічныя рады. Папоўніце “слоўнічак сінонімаў” уласнымі прыкладамі (словы не павінны выходзіць за межы названай тэматычнай групы).
3. Выпішыце з тэксту 6 слоў, у якіх колькасць літар і гукаў не супадае. Коратка растлумачце гэту з’яву (пазбягайце аднастайнасці ў прыкладах).
4. Прыметнікі ў тэксце размяркуйце па разрадах. Ад трох прыметнікаў утварыце ўсе магчымыя формы ступеней параўнання.
5. Зрабіце марфемны і словаўтваральны разбор падкрэсленых у тэксце слоў.

Рэпазіторый ВДУ

## Варыянт 2

*Спішыце тэкст. Выканайце змешчаныя пасля яго заданні.*

Зойдзем у хату, якой яна была яшчэ нядаўна, а часам сустракаецца і зараз. Выгляд яе для кожнай мясцовасці быў розны. Але найбольш тыповы быў такі. Ля ўвахода, справа, месца для мыцця посуду і іншых кухонных рэчаў. Пасля – печ. За печчу, па правай сцяне, – нары. Пад імі складалі розныя рэчы. Часам замест нараў стаялі шырокія ложкі. Уздоўж астатніх дзвюх сцен ішлі шырокія лавы, пакрытыя тканымі налаўнікамі. На іх сядзелі. Ноччу на лавах маглі спаць, асабліва калі бывалі госці.

Перад лаўкамі – стол. Заўсёды дужа белы, бо яго часта скрэблі нажом. Стол і лаўкі часцей за ўсё былі з тоўстых дубовых дошак. Ля той сценкі, дзе дзверы, стаялі куфры і гаспадыніны кросны.

Упрыгожвалі хату тканыя посцілкі. І, вядома ж, рушнікі. На іх звычайна пераважае вясёлка: жоўты, чырвоны, сіні, блакітны і іншыя колеры. Прыгожа і ўтульна было!

**Заданні**

1. Выпішыце з тэксту 5-6 слоў, у якіх ёсць арфаграмы. Падкрэсліце і вусна растлумачце іх.
2. Якія, на Вашу думку, словы маюць нацыянальна-культурную афарбоўку? Выпішыце і растлумачце іх значэнне.
3. Асобна выпішыце адзіночналікавыя і множналікавыя назоўнікі.
4. Сярод падкрэсленых словаспалучэнняў знайдзіце і выпішыце тыя, якія не з'яўляюцца словазлучэннямі.
5. Выпішыце аднасастаўныя сказы, укажыце іх від.
6. Укажыце ўскладненыя сказы. Чым яны ўскладнены?
7. Вызначце стыль і тып тэксту. Коратка абгрунтуйце сваю думку.

## Варыянт 3

*Спішыце тэкст, уставіўшы прапушчаныя літары і раскрыўшы дужкі. Выканайце змешчаныя пасля тэксту заданні.*

Калі парою лістапад…
У вырай а…лятаюць птушкі,
Яны ў дубровах пакідаюць
Сва… в…сновыя напевы,
Каб не згубіць іх не(й)дзе часам
У хмарным небе на чужын… .
Таму ўсе дрэвы на галінах
Заўсёды беражна гайдаюць
Пакінутыя гнёзды птушак,
Дзе, быццам у калысках, ціха,
Закалыхан(н)ыя, спяць песні,

Рэпазіторый ВДУ

Усе трэлі, свісты, перасвісты,
Куван(н)і, звоны, перагуды,
Лясныя шумы, перашумы.

М. Танк.

**Заданні**

1. Зрабіце фанетычны разбор слова *спяць*.

2. Дакажыце, што словы *вырай* і *гняздо* мнагазначныя. Значэнні слоў праілюструйце на прыкладах словазлучэнняў ці сказаў.

3. Прывядзіце з тэксту прыклады матываваных слоў і растлумачце іх паходжанне (матываваная назва – гэта слова з вытворнай асновай, значэнне якога абумоўлена (матывавана) значэннем другой назвы).

4. Зрабіце словаўтваральны і марфемны разбор слоў *лістапад, напеў, пакінуты, часам.*

5. Які канчатак трэба ўжыць у назоўніку *лістапад…*? Чаму? Ці можа гэты назоўнік у форме роднага склону адзіночнага ліку мець іншы канчатак?

6. Знайдзіце ў тэксце прыклад суплетыўнай формы склону. Прывядзіце іншыя прыклады суплетывізму.

7. Зрабіце поўны сінтаксічны разбор першага сказа, пабудуйце яго схему.

8. Ахарактарызуйце вобразныя сродкі, выкарыстаныя аўтарам у вершы.

### Варыянт 4

*Спішыце тэкст. Выканайце змешчаныя пасля яго заданні.*

Калі паглядзець з замчышча ўніз, на той бок дарогі, то ўважлівае вока ўбачыць правей старой таполі ледзь прыкметны пагорачак – дзядзінец колішняга фальварка. Менавіта гэтая мясціна і прыцягвае сюды людзей – турыстаў, следапытаў, аматараў гісторыі. У доме, што стаяў на тым пагорачку, у тысяча семсот сорак шостым годзе нарадзіўся Тадэвуш Касцюшка.

Касцюшка паходзіць з беларускага шляхецкага роду. Шмат якія продкі яго былі знакамітымі па тым часе людзьмі. Сам Тадэвуш скончыў Варшаўскі кадэцкі корпус, стаў палітычным і ваенным дзеячам.

Таленавіты палкаводзец, барацьбіт за свабоду, праціўнік прыгнёту, Тадэвуш Касцюшка добраахвотнікам удзельнічаў у вайне за незалежнасць Злучаных Штатаў Амерыкі.

Гуманіст, змагар за справядлівасць і дабрачыннасць, ён становіцца галоўнакамандуючым узброеных сіл паўстання тысяча семсот дзевяноста чацвёртага года ў Польшчы, Беларусі і Літве.

Тадэвуш Касцюшка заўсёды быў прынцыповым. Ён адмовіўся супрацоўнічаць як з імператарам Францыі Напалеонам I, так і з



Репозиторий ВГУ

Аляксандрам I – расійскім імператарам. А як яны хацелі выкарыстаць яго імя дзеля сваіх інтарэсаў!

Тадэвуш Касцюшка з гонарам пранёс праз жыццё сцяг Чалавека.

Паводле Я. Пархуты.

**Заданні**

1. Вызначце, да якога стылю належыць тэкст. Пісьмова абгрунтуйце сваю думку. Дайце загаловак, які б перадаваў асноўную думку тэксту.

2. Выпішыце з тэксту ўласныя імёны, у якіх ужываецца вялікая літара. Растлумачце яе правапіс.

3. Выпішыце словы з прыстаўнымі зычнымі. Растлумачце іх правапіс.

4. Асобна выпішыце словы з падоўжанымі і падвоенымі зычнымі. Абгрунтуйце сваю думку адносна падаўжэння і падваення зычных у выпісаных словах.

5. Зрабіце марфемны разбор дзеяслова *супрацоўнічаць*. Прывядзіце прыклады іншых дзеясловаў з марфемай *су*-. Якое агульнае значэнне яны маюць?

6. Выпішыце запазычаныя словы. З якіх моў яны запазычаны? Растлумачце іх значэнне, з якім яны ўжыты ў тэксце.

7. Выпішыце па два прыклады словазлучэнняў на кожны від падпарадкавальнай сувязі (дапасаванне, кіраванне, прымыканне).

8. Падкрэсліце прыдаткі ў сказах. Растлумачце знакі прыпынку пры іх.

Репозиторий ВГУ

# ЛІТАРАТУРА

**Асноўная**

1. Абабурка, М.В. Культура беларускай мовы / М. В. Абабурка. – Мінск, 1994.

2. Басава, Г. І. Святло слова: Дапам. па лінгвакультуралогіі для студ. філал. спец. / Г. М. Басава. – Мінск, 2002.

3. Дзядова, А.С. Чалавек у люстэрку беларускай фразеалогіі і парэміялогіі: манаграфія / А.С. Дзядова. – Віцебск, 2013.

4. Каўрус, А.А. Стылістыка беларускай мовы / А. А. Каўрус. – Мінск, 1990.

5. Красней, В.П. Грані слова, выд. 3-е. / В. П. Красней.– Мінск, 1996.

6. Куліковіч, У. І. Алімпіяды па беларускай мове і літаратуры: Заданні да комплекснай работы. Водгук на мастацкі твор. Вуснае выказванне / У. І. Куліковіч. – Мінск, 2014.

7. Куліковіч, У.І. Матэрыялы раённых алімпіяд па беларускай мове (2003–2005 гг.) / У. І. Куліковіч. – Мінск, 2006.

8. Куліковіч, У. І. Тэхналогія падрыхтоўкі да алімпіяды па беларускай мове і літаратуры / У. І. Куліковіч.– Мінск, 2010.

9. Куліковіч, У.І. Школьныя алімпіяды па беларускай мове / У. І. Куліковіч. – Мінск, 2006.

10. Лепешаў, І.Я. Асновы культуры мовы і стылістыкі / І.Я. Лепешаў. – Мінск, 1987.

11. Ляшчынская, В.А. Сучасная беларуская мова: фразеалогія: вучэб.дапам. / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2010.

12. Малажай, Г.М. Алімпіяды па беларускай мове. Дапам. для навучэнцаў агульнаадукац. школ, гімназій, ліцэяў. 2-е выд. / Г. М. Малажай, В. П. Красней. – Мінск, 2001.

13. Малажай, Г.М. Сучасная беларуская мова: Слова. Перыфраза. Фразеалагізм / Г. М. Малажай. – Мінск,1992.

14. Сцяцко, П.У. Культура мовы / П. У. Сцяцко. – Мінск, 2002.

**Дадатковая**

1. Абабурка, М. В. Асаблівасці перакладу тэкстаў на беларускую мову / М. В. Абабурка. – Магілёў, 1999.

2. Арцямёнак, Г. А. Рэспубліканская алімпіяда па беларускай мове і літаратуры: аналіз заданняў і парады / Г. А. Арцямёнак, В. Л. Варановіч, А. А. Радзевіч, С. М. Якуба // Беларуская мова і літаратура. –2013. – № 12. – С. 41–46.

3. Данич, О.В. Менталитет белорусов и русских. Отражение в мифологии, фольклоре, фразеологии / О.В. Данич. – Витебск, 2004.

4. Коваль, У.І. Чым адгукаецца слова: Фразеалогія ў павер’ях, абрадах і звычаях / У. І. Коваль. – Мінск, 1994.

Репозиторий ВГУ

5. Лепешаў, І.Я. Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні / І.Я. Лепешаў. –Гродна, 2002.

6. Лепешаў, І.Я. Чаму мы так гаворым: даведнік / І.Я. Лепешаў. – Гродна, 2003.

7. Прыгодзіч, М.Р. Шчодрасць слова / М. Р. Прыгодзіч. – Мінск, 1990.

8. Старычонак, В. Д. Займальная філалогія / В.Д. Старычонак. – Мінск, 1998.

9. Сцяцко, П.У. Праблемы нормы, культуры мовы / П. У. Сцяцко.– Гродна, 1998.

10. Юрэвіч, У. Слова жывое, роднае, гаваркое…: Дапам. для настаўнікаў / У. Юрэвіч. – Мінск,1998.

11. Янкоўскі, Ф.М. Само слова гаворыць / Ф. М. Янкоўскі. – Мінск,1984.

**Слоўнікі. Даведнікі**

1. Арашонкава, Г.У. Кіраванне ў беларускай і рускай мовах: Слоўнік-даведнік / Г. У. Арашонкава, В. П. Лемцюгова. – Мінск, 1991.

2. Бардовіч, А.М. Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы / А. М. Бардовіч, М. М. Круталевіч, А. А. Лукашанец. – Мінск, 2000.

3. Беларуская мова: Энцыклапедыя. – Мінск, 1994.

4. Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Мінск, 2004.

5. Беларускі арфаграфічны слоўнік / пад рэд. А. А. Лукашанца. – Мінск, 2009.

6. Гаўрош, Н.В. Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы / Н. В. Гаўрош. – Мінск, 1998.

7. Грабчыкаў, С.М. Слоўнік паронімаў беларускай мовы / С. М. Грабчыкаў. – Мінск, 1994.

8. Іванова, С.Ф. Слоўнік беларускіх прыказак, прымавак і крылатых выразаў: Лінгвакраіназнаўчы дапаможнік / С.Ф. Іванова, Я. Я. Іваноў. – Мінск, 1997.

9. Клышка, М.К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў. 2-е выд. / М. К. Клышка. – Мінск, 1993.

10. Лазоўскі, У.М. Слоўнік антонімаў беларускай мовы / У. М. Лазоўскі. – Мінск, 1992.

11. Лепешаў, І.Я. Слоўнік беларускіх прыказак / І. Я. Лепешаў, М. А. Якалцэвіч. – Мінск, 2006.

12. Лепешаў, І.Я. Слоўнік фразеалагізмаў: у 2-х т. / І.Я. Лепешаў. – Мінск, 2008.

13. Лепешаў, І.Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І. Я. Лепешаў. – Мінск, 2004.

14. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны: у 2 ч. / Л. І. Злобін (рэд.) [і інш.]. – Віцебск, 2012. – Ч. 1.

Репозиторий ВГУ

15. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны : у 2 ч. / склад. : Г. К. Семянькова, Т. А. Грачыха, А. С. Дзядова [і інш.] ; пад рэд. А. С. Дзядовай. – Віцебск: ВДУ імя П.М.Машэрава, 2014. – Ч. 2. – 358 с.
16. Слоўнік беларускай мовы: Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне. – Мінск, 1987.
17. Старычонак, В.Д. Слоўнік амонімаў беларускай мовы / В. Д. Старычонак. – Мінск, 1991.
18. Шкраба, І.Р. Слоўнік беларускай безэквівалентнай лексікі / І. Р. Шкраба.– Мінск, 2008.
19. Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. – Мінск, 1989.

Репозиторий ВГУ

# ЗМЕСТ

**Прадмова** ……………………………………………………………. 3

**Сучасныя тэхналогіі рашэння лінгвістычных задач** ……………. 4

**Метадычныя каментарыі да практычных заняткаў** …………… 6

**Тэма 1.** Фанетычная сістэма беларускай мовы. Беларуская арфаэпія і акцэнтуацыя ………………………………………………………... 11

**Тэма 2.** Лексікалогія. Лексікаграфія …………………………….. 12

**Тэма 3.** Фразеалогія. Фразеаграфія ………………………...……. 18

**Тэма 4.** Марфеміка. Словаўтварэнне ………………..……………….. 21

**Тэма 5.** Марфалогія. Граматычныя нормы назоўніка ……………… 24

**Тэма 6.** Прыметнік. Лічэбнік. Займеннік. Іх граматычныя нормы … 26

**Тэма 7.** Дзеяслоў і яго граматычныя формы ………………………… 29

**Тэма 8.** Словазлучэнне. Просты сказ ………………………………… 31

**Тэма 9.** Складаны сказ ……………………………………………… 33

**Тэма 10.** Тэкст. Культура мовы. Мова і грамадства ………………… 38

**Комплексныя заданні да заліку** ………………………………… 40

**Літаратура** ........................................................................................ 44

Рэпазіторый ВГУ

Вучэбнае выданне

**ДЗЯДОВА** Алена Сяргееўна

**СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ПАДРЫХТОЎКІ ДА АЛІМПІЯДЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ**

Метадычныя рэкамендацыі


Тэхнічны рэдактар *Г.У. Разбоева*

Камп'ютарны дызайн *Т.Я. Сафранкова*

Падпісана ў друк .2015. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 2,79. Ул.-выд. арк. 2,17. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне – установа адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава".

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/255 ад 31.03.2014 г.

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава».
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.


Репозиторий ВГУ